ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьяш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ураду.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СЕРАДА
23 красавіка 1930 г.
№ 95 (3603)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Мабілізуем увагу пралетарскай грамадзкасьці вакол пытаньняў культурнага будаўніцтва

(Да Усесаюзнай нарады пры ЦК УсеКП(б))

Бурны ход будаўніцтва нашае сацыялістычнае гаспадаркі, нябачаныя тэмпы росту прамысловасьці, масавы рух бядняцка-серадняцкіх мас да новых калектыўных форм сельскае гаспадаркі, ідуць поруч з ажыцьцяўленьнем задач культурнай рэвалюцыі.

Тав. Ленін у артыкуле «Аб каапэрацыі» кажа: «... Для нас дастаткова цяпер гэтай культурнай рэвалюцыі для таго, каб зрабіцца цалкам сацыялістычнай краінай, але для нас гэтая культурная рэвалюцыя прадстаўляе няміверныя цяжкасьці і чыста культурнай уласьцівасьці (бо мы няпісьменныя), і уласьцівасьці матар'яльнай (бо для таго, каб быць культурным — патрэбна вядомае разьвіцьцё матар'яльных продкаў вытворчасьці, патрэбна вядомая матар'яльная база).

Сёньня мы можам сказаць, што галоўная прадпасылка — матар'яльная база ў асноўным створана, больш таго, ёсьць у наяўнасьці пагроза адставаньня культурнага росту ад хуткіх тэмпаў гаспадарчага будаўніцтва.

Зразумела, што наша сацыялістычнае будаўніцтва праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Сацыялістычны сэктар нашай гаспадаркі і прамысловасьці і ў таварарвароце ўсё больш і больш выціскае, выбівае з пазыцый прыватніка, прамыслоўца і гандляра.

Мы паставілі задачу ліквідацыі, на падставе суцэльнай калектывізацыі, кулацтва, як клясы. Зразумела, што ўсё гэта выклікае шалёнае супраціўленьне і кулака, і непмана, спрыяе абвастрэньню клясавай барацьбы. Гэтае абвастрэньне клясавай барацьбы мы маем і на фронце ідэалёгічным, а ў нашых умовах на фронце будаўніцтва нацыянальнай культуры. Ва ўмовах Беларусі мы перажываем паласу актыўных выступленьняў і беларускіх нацыянал-дэмакратаў і шавіністых іншых колераў.

Наколькі праблема ліквідацыі кулацтва, як клясы, застаецца, наколькі кулак яшчэ застаецца, настолькі застаюцца карэньні нацыянал-дэмакратызму і шавінізму. Барацьба з беларускім нацыянальным дэмакратызмам, як галоўнай небясьпекай, застаецца і на сёньня, тым больш, што нацыянал-фашысцкія элементы ў Заходняй Беларусі, у сувязі з правадзімай у нас лініяй на ліквідацыю кулацтва, як клясы, праяўляюць асаблівую актыўнасьць у цкаваньні БССР і Савецкага Саюзу, выконваючы заданьні польскага фашызму аб падрыхтоўцы глебы да ўзброенага нападу на нас

Перад намі і надалей застаецца, як першачарговая задача, ачышчацца ад ўсяго варожага, антыпралетарскага, нацыяналістычнага, наколькі ўсё гэта зьяўляецца тормазам нашага далейшага і гаспадарчага і культурнага росту, перашкаджае сацыялістычнаму будаўніцтву.

З большай пільнасьцю мы павінны сачыць за ўзростам актыўнасьці вялікадзяржаўнага рускага шавінізму, які на сёньня таксама падымае галаву, і на гэтай галаве трэба як сьлед ударыць.

Задачы, якія стаяць перад Усесаюзнай партыйнай нарадай па пытаньнях асьветы — гэта ўзьняць на належную вышыню, работу культурнага сэктару, бо як вядома, што культурны сэктар значна адстае ад іншых галін нашага сацыялістычнага будаўніцтва, а гэта адставаньне стварае пагрозу ў далейшым разьвіцьці і прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Індустрыялізацыя краіны, сацыялістычная рэканструкцыя вёскі патрабуюць, па-першае, пагалоўна пісьменных людзей, і па-другое — вялізарнага ліку кадраў інжынэраў, тэхнікаў, агранамаў, настаўнікаў і г. д.

Таму сёньня, як ніколі, стаіць задача культурнага абслугоўваньня працоўных мас, стаіць неабходнасьць вырашыць праблему кадраў, адным словам, стаіць пытаньні ўсяго таго, што павінна садзейнічаць хутчэйшаму ажыцьцяўленьню задач культурнай рэвалюцыі.

Сярод пытаньняў, што стаяць на абгаварэньні нарады, пытаньне сыстэмы народнае асьветы зьяўляецца найбольш актуальным, наколькі адзіны план гаспадаркі Саюзу патрабуе і адзінай сыстэмы школы, наколькі неўрэгуляванасьць сыстэмы ў паасобных рэспубліках зьяўляецца галоўнай перашкодай у пасьпяховай падрыхтоўцы кадраў.

Аб тым, чым павінна быць школа ў пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізму, вельмі яскрава гаворыць праграма нашай партыі.

«У перыяд дыктатуры пралетарыяту, г. зн. у перыяд падрыхтоўкі умоў, якія робяць магчымым поўнае ажыцьцяўленьне камунізму, школа павінна быць ня толькі праваднікам прынцыпаў камунізму наогул, але і праваднікам ідэёвага, арганізацыйнага, выхаваўчага ўплыву пралетарыяту на паўпралетарскія і непралетарскія пласты працоўных мас з мэтаю выхаваньня пакаленьня, здольнага капчаткова ўстанавіць камунізм».

Як на адну з бліжэйшых задач, праграма камуністычнае партыі паказвае: «Поўнае ажыцьцяўленьне прынцыпаў адзінай працоўнай школы з выкладаньнем на роднай мове, з сумесным навучаньнем дзяцей, і хлапцоў, і дзяўчат, бязмоўна савецкай, г. зн. свабоднай ад якога-б ні было рэлігійнага впливу, праводзячай цесную сувязь навучаньня з грамадзка-прадукцыйнай працай і надрыхтоўваючай усебакова разьвітых членаў камуністычнага грамадзтва».

Праграма дае ясную ўстаноўку адносна характару і зьместу асьветы, якая дасецца нашай сярэдняй школай: «Шырокае разьвіцьцё прафэсыянальнай асьветы для асоб ад 17-гадовага ўзросту ў сувязі з агульнымі палітэхнічнымі ведамі».

Вялізарнай патрэбна кадраў, недастатковасьць належнай матар'яльнай базы прымусілі часова абмежаваць пачатковую палітэхнічную школу не 17-ю, а 15-ю гадамі.

Умовы матар'яльнага характару не дазвалялі ажыцьцявіць і патрабаваньні праграмы партыі аб адзінай працоўнай школе і аб прафэсыянальна-тэхнічнай асьвеце.

У паасобных рэспубліках саюзу мы маем розныя сыстэмы. Больш таго, унутры кожнай рэспублікі, побач з захаваўшайся старой школай (дзевяцігодка) мы маем выкліканы жыцьцём і тып новай школы: фабзавуч, прафшкола, школа сялянскай моладзі.

У БССР стаіць востра пытаньне аб сярэднім зьвяне прафэсыянальна-тэхнічнай асьветы, разрыў паміж сямігодкай і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі звузіў магчымасьці, асабліва для васковай бядняцка-серадняцкай моладзі, папасьці ў вышэйшую школу.

Адзіны план пабудовы ўсяе сацыялістычнае гаспадаркі Саюзу патрабуе і адзінай сыстэмы нашае асьветы.

Усебеларуская партыйная нарада, па пытаньнях асьветы, якая толькі адбылася, ухваліла, як аснову пачатковага палітэхнічнага навучаньня — сямігодку з папярэднім праходжаньнем дзецьмі дзіцячага саду.

Сярэдняя школа, школа прафэсыянальна-тэхнічная павінна даць на сёньнешні дзень тэхнікаў для нашае прамысловасьці, а ў аснове яна павінна рабіцца школа-фабрыкай, школай буйнога зямляробства і выхоўваць кадры рабочых для прамысловасьці і кваліфікаваных работнікаў сельскае гаспадаркі.

Адсюль, сярэднім зьвяном ў школьнай сыстэме павінны стаць фабзавуч, прафшкола, школа калгаснай моладзі і тэхнікумы. Апошнія павінны падрыхтоўваць сярэдні тэхнічны пэрсанал

Рабфакі павінны застацца галоўнай установай для падрыхтоўкі рабочых у ВУЗ'ы. Вышэйшая школа павінна будавацца паводле пастановы XVI партканфэрэнцыі—па «отраслевым» зьвеньнях прамысловасьці для падрыхтоўкі інжынэраў вузкай кваліфікацыі з курсам на ажыцьцяўленьне ідэі заводу—ВТУЗ'у.

Такая перабудова дасьць нам палітэхнічную школу ў сваёй аснове, з прафэсыянальнай палітэхнічнай сярэдняй школай і вузамі вузкай інжынэрнай кваліфікацыі.

Поруч з задачай выхаваньня дзяцей працоўных, сёньня стаіць задача больш рацыянальнай, больш плянавай пастаноўкі палітычнага выхаваньня і культурнага абслугоўваньня дарослага працоўнага насельніцтва. Гэтай справай сёньня займаюцца дзесяткі розных устаноў і арганізацый. Поравень з палітпрасьветам НКА культасьветную працу вядуць і культадзелы прафсаюзаў, і культурныя аддзелы розных сыстэм каапэрацыі і рад іншых арганізацый. У рабоце гэтых арганізацый наглядаецца поўны разброд, няма адзінага пляну, няма патрэбнай увязкі. Адсюль часта нерацыянальная трата, і сродкаў, і людзкое энэргіі.

Партнарада прыпала «неабходнасьць ранней за ўсё ў адпаведнасьці з характарам нашае вытворчасьці, нашымі ўстаноўкамі, новай тэхнічнай базай і новымі сацыялістычнымі мэтадамі работы напова перабудаваць усю нашу культурную работу, вызначыць новыя формы і мэтады яе, мабілізаваць увагу шырокай пралетарскай грамадзкасьці вакол задач культурнай работы, узьняць шырокія пласты працоўных мас на барацьбу за культуру, вывіць усе культурныя сілы краіны, уцягнуць іх у актыўнае будаўніцтва культуры. На сучасным этапе разьвіцьця культурная работа павінна быць вельмі шчыльна ўвязана з пераварэньнем быту працоўных, яна павінна грацъ вялізарную ролю ў гэтым пераварэньні. У нашай агульнай рабоце мы павінны ўзяць цьвёрды курс на набліжэньне фізычнай працы з працай інтэлектуальнай.

«Для больш пасьпяховага выраішэньня вызначаных задач, партнарада выказалася за стварэньне адзінага плянуючага цэнтру ўсяе культурнае справы.

Па пытаньні аб становішчы і задачах культурнага абслугоўваньня нацменшасьцей партнарада канстатавала, што пры маючыхся дасягненьнях усё-ж культмасавая праца сярод нацменшасьцей зьяўляецца ня зусім адавальняючай і не адпавядае ўзросту культурных запатрабаваньняў у сувязі з шпаркім тэмпам індустрыялізацыі і калектывізацыі вёскі.

У сувязі з ростам варожых нам тэндэнцый — нацыянал-дэмакратызму, шавінізму розных колераў, клэрыкалізму, антысэмітызму, як праяўленьняў абвостранай клясавай барацьбы на культурным нацыянальным фронце неабходна для барацьбы з гэтымі варожымі плынямі мабілізаваць ўсю пралетарскую грамадзкасьць, усе сілы культурнага фронту.

Справе інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня, як у школах, так і ва ўсёй палітасьветнай рабоце павінна быць аддана значна больш увагі, чым дагэтуль.

Вялізарныя задачы культурнага будаўніцтва патрабуюць пераварэньня органаў нарасьветы ў штабы культурнай рэвалюцыі.

Наркамасьветы, аслабяніўшыя ад непасрэднага кіраўніцтва школьнымі (апроч вузаў) і палітасьветнымі ўстановамі, павінен занялца плянаваньнем народнай асьветы, пытаньнямі падрыхтоўкі кадраў, ажыцьцяўляць ідэалёгічнае і мэтадычнае кіраўніцтва ўсёй культурна-асьветнай работай. Разам з гэтым павінен быць больш сталы кантроль і сталая дапамога над работай органаў Нарасьветы з боку пралетарскай грамадзкасьці, з боку партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.

Навокал пытаньняў культурнага будаўніцтва неабходна мабілізаваць увагу пралетарскай грамадзкасьці, шляхам шырокага абгаварэньня і пытаньняў сыстэмы асьветы і культмасавай працы на рабочых сходах, сходах беднаты, культработнікаў, настаўніцтва і г. д.

А. СЯНЬКЕВІЧ.

Узнагарода ордэнам працоўнага Чырвонага сьцягу ўсяго калектыву Турксібу

МАСКВА, 20. 1-га мая канчаецца будаўніцтва Туркестана-Сібірскай чыгункі. Пабудова Турксібу была вельмі цяжкай. Поспехі будаўніцтва Турксібу дасягнуты дзякуючы энтузіязму і творчай энэргіі рабочых мас і інжынэрна-тэхнічных сіл. У сувязі з гэтым **ЦВК і Саўнарком СССР пастанавілі ўзнагарадзіць ордэнам працоўнага Чырвонага сьцягу ўвесь будаўнічы калектыў рабочых і інжынэрна-тэхнічных сіл Турксібу і пэрсанальна ўзнагарадзіць ордэнам начальніка пабудовы т. Шутава і акрамя яго, 9 рабочых і інжынэраў.** Адзначана будаўніцтву пад старшынствам т. Рыскулава і РСІ. Саўнаркому СССР даручана паскорыць арганізацыю ўстаноў па культурна-бытавым абслугоўваньні дарогі, правесьці ў кароткі тэрмін мерапрыемства па ўзмацненьні і сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі ў раёне дарогі, узмацніць прамысловае будаўніцтва, фарсаваць разьведку і здабычу карысных выкапняў у раёне Турксібу і скончыць у найкарацейшы тэрмін усе работы, зьвязаныя з пастаноўкай тэхнічнае гаспадаркі дарогі, а таксама ўзмацніць будаўніцтва падзяных шляхоў.

ПАСЕВЫ КАНЮШЫНЫ І ЛЁНУ--ПАД ПАГРОЗАЙ

ТРЫВОЖНЫЯ СЫГНАЛЫ з ГОМЕЛЮ і МАЗЫРА

ДАБ'ЕМСЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ НА ГЭТЫХ ВУЧАСТКАХ ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

Чаму не выкарыстоўваецца насеньне канюшыны

Весткі, якія паступаюць з месц, гавораць аб пагрозе нескарыстаньня ўсёй колькасьці канюшыны, якая сёлета завезена ў БССР. У прыватнасьці, ад Мазырскага акрпаляводсаюзу атрымана паведамленьне, што 25 проц. прысланай канюшыны не раскупляецца. Акрпаляводсаюз просіць тэрмінова даць нарад на пераадгрузку гэтай канюшыны ў іншыя округі.

Урыўкавыя даныя з іншых округ таксама сьведчаць аб невыстарчальным ходзе рэалізацыі канюшыны. Слаба купляюць канюшыну калгасы, а асабліва індывідуальны сэктар.

Становішча, якое стварылася, зьяўляецца тым больш недапушчальным, што патрэбная нам колькасьць канюшыны была завезена з вялікімі труднасьцямі, з прычыны недахвату наогул гэтай культуры ў СССР. Ня прыходзіцца апрача таго даводзіць вялізарнага значэньня пашырэньня плошчы пад канюшыну для жывёлагадоўлі БССР.

Сыгнал з Мазыршчыны павінен быць зараз-жа ўлічаны Наркамземам БССР. Нескарыстаньне канюшыны не павінна быць дапушчана. Трэба неадкладна прыняць належныя меры, вывучыўшы прычыны гэтага зьявішча.

У выпадку, калі выявіцца рэальная пагроза нескарыстаньня канюшыны індывідуальным сэктарам, трэба заразжа абмеркаваць пытаньне аб магчымасьці максымальнага пашырэньня плошчы пад канюшыну ў калгасах і саўгасах.

В.

Ад рэдакцыі: Мы чакаем тэрміновага адказу ад Наркамзему БССР па сутнасьці закранутых у гэтай заметцы пытаньняў.

ТЭЛЕГРАМА НАРКАМЗЕМА БССР

Усім акрэа

НА ПРАЦЯГУ 3-Х ДЗЁН ПРАВЕРЦЕ РЭАЛІЗАЦЫЮ МІНЭРАЛЬНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ І КАНЮШЫНЫ. ТЭЛЕГРАФУЙЦЕ АБ НАЯЎНАСЬЦІ ЯПЧЭ НЕРАЗЬМЕРКАВАНАГА ПА СТАНОВІШЧЫ НА 24 КРАСАВІКА. У ВЫПАДКУ НЕМАГЧЫМАЙ РЭЛІЗАЦЫІ ПА АКРУЗЕ. СВАЯЧАСОВА СТАЎЦЕ ПЫТАНЬНЕ АБ ПЕРАКІДЦЫ Ў ІНШЫЯ АКРУГІ

НАМ. НАРКАМЗЕМА БССР **МАСЮКОЎ.**

УВАГА ІЛЬНУ!

БССР зьяўляецца адным з ільнаводных раёнаў у Савецкім Саюзе. Таму для Беларусі выкананьне пляну пасеву ільну мае асаблівае значэньне.

Рэдакцыя зацікавілася становішчам падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы ў ільнаводных округах БССР. З гэтай мэтай супрацоўнік «Зьвязды» наведаў рад цэнтральных кіруючых устаноў, зацікаўленых справай ільнаводзтва. Аднак, ні адна ўстанова не магла даць канкрэтнага адказу, як стаіць справа з пасевам ільну ў гэтым годзе.

Паводле вестак на 10 красавіка, у Гомельскай акрузе план кантрактацыі ільну выкананы на 78 проц., у Бабруйскай — на 83 проц., у Мазырскай — 70 проц., Менскай — 43 проц., Полацкай—36 проц. і Аршанскай—20 проц. У сярэднім план кантрактацыі па 6 акругах выкананы толькі на 43 проц.

Кантрактуючыя арганізацыі і акрганделі ўдзяляюць вельмі мала ўвагі кантрактацыі ў індывідуальным сэктары. Даволі сказаць, што з агульнай колькасьці закантрактаваных ільнапасеваў на індывідуальны сэктар прыпадае толькі 17 проц. На Полацкай ільнаводнай і на Мазырскай округах з індывідуальнымі гаспадаркамі не заключаны ні адзін дагавор.

Паданыя факты сьведчаць аб тым, што дырэктывы вышэйшых органаў аб узмацненьні работы па кантрактацыі ільнапасеваў у індывідуальным сэктары дасюль ня выконваюцца. Гэта і прымусіла ЭКАНА БССР прадоўжыць тэрмін кантрактацыі да 15-га мая. Але і ў гэты тэрмін план кантрактацыі ня будзе выкананы, калі мясцовыя арганізацыі, і ў першую чаргу сыстэма наркамзёмаў каапэрацыі, ня прымуць самых шырокіх мер да фарсаваньня кантрактацыі і не перавядуць гэтае работы на балевыя тэмпы.

Усёй сыстэме с.-г. каапэрацыі трэба неадкладна прыступіць да праверкі заключаных раней дагавораў з калгасамі, да пераазаключэньня іх у адпаведнасьці з наяўнай плошчай пасеваў.

Мы б'ем трывогу: план пасеву ільну знаходзіцца пад пагрозай. Трэба прыняць самыя рашучыя меры да забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну.

Весткі аб ходзе кантрактацыі ёсьць толькі з 6 округ. 2 ільнаводныя округі (Віцебская і Магілёўская) вестак не прыслалі. Гэта выразна сьведчыць аб тым, што па гэтых округах кантрактацыя праходзіць зусім слаба.

Паводле вестак на 10 красавіка, у Гомельскай акрузе план кантрактацыі ільну выкананы на 78 проц., у Бабруйскай — на 83 проц., у Мазырскай — 70 проц., Менскай — 43 проц., Полацкай—36 проц. і Аршанскай—20 проц. У сярэднім план кантрактацыі па 6 акругах выкананы толькі на 43 проц.

Кантрактуючыя арганізацыі і акрганделі ўдзяляюць вельмі мала ўвагі кантрактацыі ў індывідуальным сэктары. Даволі сказаць, што з агульнай колькасьці закантрактаваных ільнапасеваў на індывідуальны сэктар прыпадае толькі 17 проц. На Полацкай ільнаводнай і на Мазырскай округах з індывідуальнымі гаспадаркамі не заключаны ні адзін дагавор.

Паданыя факты сьведчаць аб тым, што дырэктывы вышэйшых органаў аб узмацненьні работы па кантрактацыі ільнапасеваў у індывідуальным сэктары дасюль ня выконваюцца. Гэта і прымусіла ЭКАНА БССР прадоўжыць тэрмін кантрактацыі да 15-га мая. Але і ў гэты тэрмін план кантрактацыі ня будзе выкананы, калі мясцовыя арганізацыі, і ў першую чаргу сыстэма наркамзёмаў каапэрацыі, ня прымуць самых шырокіх мер да фарсаваньня кантрактацыі і не перавядуць гэтае работы на балевыя тэмпы.

Усёй сыстэме с.-г. каапэрацыі трэба неадкладна прыступіць да праверкі заключаных раней дагавораў з калгасамі, да пераазаключэньня іх у адпаведнасьці з наяўнай плошчай пасеваў.

Мы б'ем трывогу: план пасеву ільну знаходзіцца пад пагрозай. Трэба прыняць самыя рашучыя меры да забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну.

Угнаеньне і віка прывезены з вялікім спазьненьнем

(Ад нашага мазырскага карэспандэнта)

У калгасах ужо скончана сяўба раньніх культур, як аўсу і лубіну. Ідзе пасадка раньняй бульбы. Насеньнем калгасы забясьпечаны. Значна горшая справа з угнаеньнем, якога не пасьпелі своячасова прывезьці ў округу. Заразі, калі сяўба ўжо ў разгары, пачалі прыбываць вагоны з угнаеньнем. Зразумела, што выкарыстаць іх цяпер наўрад ці ўдасца. Такое становішча і з насеньнем вікі, якую пачалі прывозіць толькі зараз. Гэта затрымала сяўбу вікі.

У некаторых мясцох заўважаецца супраціўленьне ажыцьцяўленьню дырэктыў ураду аб ільготах калгасьнікам. Напрыклад, акрфінаддзел дагэтуль не скасаваў штрафаў на тых беднякоў і сераднякоў, якія ўступілі ў калгас.

Папулярызацыя ільгот па новым с.-г. падатку ідзе вельмі марудна. Разасланыя інструкцыі і літаратура загрузлі ў сталох і шафах райвыканкомаў і сельсаветаў. **Сялянства аб гэтым нічога ня ведае. На пленумах райвыканкомаў і сельсаветаў ільготы па новым с.-г. падатку амаль зусім не абмяркоўваліся.** Хутка пачнецца ўлік аб'ектаў абкладаньня. Але падрыхтоўкі да гэтай работы пакуль што ніякай не вядзецца. Загадчыкі фінчастак райвыканкомаў заняты ўсякімі іншымі справамі.

Рапарт калгасу імя „Зьвязды"

У жорстких клясавых бойках прыступіў да веснавой сяўбы калгас імя газ. «Зьвязда».

Калгас аб'яднае 61 гаспадарку вёсак Бібікі і Нізкі Лес на плошчы ў 520 гэкт.

Калгас мае 45 рабочых коняй, 48 аднаконных плугоў, тры санаўсіня і тры лямешныя плугі, 50 барон, 2 дыскавыя сяўкі і адну канюшынную.

Калгас будуе малочную гаспадарку і ўжо мае 148 кароў.

Зараз калгасьнікі дружна і энэргічна праводзяць паллывы работы. Уводзіцца дзевяціпалёвы севазварот. Калгасам ужо засеяна 65 гэкт. аўсу і 80 гэкт. канюшыны і цімафееўкі.

Мяркуецца засеяць 25 гэкт. вікавай мешаніны, 50 гэкт. кукурузы, 50 гэкт. бульбы, 25 гэкт. нармавое бручкі і турнэпсу, 40 гэкт. грэчкі, 10 гэкт. проса і 5 гэкт. гародніны. Гэта—рабочы план веснавой сяўбы.

У калгасе напружанае становішча з рабочай цягавай сілай. Не хапае коняй, не хапае рабочых рук. Але калгасьнікі спадзяюцца, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры дапамозе шэфа—газэты «Зьвязда» і мабілізацыі ўсіх сваіх сіл і сродкаў яны здолеюць правесьці веснавую сяўбу і пабудаваць інтэнсыўную малочную гаспадарку.

Старшыня калгасу ПАЗЬНЯКЕВІЧ.
Аграном МАРКАЎ.
Вёска Бібікі, Нараўлянскага раёну, калгас «ЗЬВЯЗДЫ».

Зводкі з пасеўнага фронту

Мазырская акруга

МАЗЫР. Паводле даных на 15 красавіка па Мазырскай акрузе засеяна 2.124 гэкт. зямлі па калгасным сэктары і 5.982 гэкт. у індывідуальным сэктары.

Паводле пляну, у калгасах Мазырскай акругі павінна быць засеяна 27.520 гэкт. і ў індывідуальных гаспадарках—109.944 гэкт.

Такім чынам, план засеву выкананы: у калгасах на 7,7 проц., у індывідуальным сэктары—на 5,4 проц.

Калі ўзяць асобныя культуры, дык будзе такі малюнак: у калгасах засеяна пшаніцай 109 гэкт., ярыцай—41гэкт., аўсом—1.508 гэкт., ячменем—297, ільном—29, канаплямі—3, бульбай—23, вікай—65, канюшынай—246 і г. д.

У індывідуальных гаспадарках засеяна: пшаніцай 396 гэкт., ярыцай 226, аўсом—3.306, ячменем—1.388, ільном—112, канаплямі—2, бульбай—467, вікай—58, канюшынай—77 гэктараў і г. д.

Магілеўская акруга

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Паводле папярэдніх вестак на 16 красавіка, процант выкананьня пляну сяўбы па калгасах акругі дасягае 4,3 проц., а па індывідуальных гаспадарках—1,9 проц.

Калгасы Чэрыкаўшчыны ўжо скончылі сяўбу ячменю і выканалі агульны план сяўбы ў разьмеры 8,4 проц. Індывідуальнікі Чэрыкаўшчыны засеялі 3,9 проц. пляну. У Кармянскім раёне калгасы засеялі 7,1 проц., індывідуальнікі—4,2 проц. У Клімавіцкім раёне калгасы засеялі 4,8 проц., індывідуальнікі—6,6 проц. У Крычаўскім раёне калгасы засеялі 3,8 проц., індывідуальнікі—1 проц. Рэшта раёнаў засеяла ад 0,1 проц. да 1 проц. пляну.

Па некаторых культурах, як, напрыклад, па ячмені план сяўбы ў калгасах выкананы: ў Чэрыкаўшчыне на 103 проц., у Кармянскім—52 проц. і Клімавічах—19 проц. Пшаніцы засеяна: у Кармянскім раёне 54 проц. пляну, Чэрыкаўскім—43 проц. і Клімавіцкім—41 проц.

Барысаў адгружае 5 вагонаў попелу на Мар'іна

У Менску заўтра масавы паход па попел

Праца распачалася

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). Барысаўскі камсамол жвава адгукнуўся на прапанову «Зьвязды» арганізаваць збор попелу для адгрузкі яго на Мар'іна. Ужо два дні атрадам «Лёгкай Кавалерыі» вядзецца выяўленьне попелу на мясцовых прадпрыемствах і ў жаўтах. Вынікі такія. На заводзе імя Роозы Люксэмбург выяўлена 200 пуд. попелу, на гарбарнім—500 пуд., на гарбарні—100 пуд., на фабрыцы «Рабочы»—450 пуд. і г. д. Сёньня канчаецца выяўленьне попелу ў жаўтах.

Камсамол і піянэры ўзялі на сябе працу на адгрузцы попелу, а таксама націскаюць на мясцовы райпаляводсаюз, каб гэта справа была тэрмінова арганізавана і ажыцьцёўлена.

Усяго Барысаў мяркуе адгрузіць камуне імя БВА і саўгасу імя «Дзесяцігодзьдзя БССР 5 вагонаў попелу.

На заводзе імя Домбаля выяўлена каля 3.000 пуд. попелу, але ён няпрыгодны на ўгнаеньне з тае прычыны, што зьмешаны з тарфяным попелам.

Сёньня Барысаў прыступ[illegible] на перавозкі попелу з прадпрыемстваў і жаўтаў на станцыю і нагрузкі яго ў вагоны.

24-га збор і адгрузка

Учора пры Менскім акр[illegible]коме камсамолу адбылася нарада [illegible] і Чырвонай армії, на якой прыня[illegible] пастанова аб правядзеньні 24-га красавіка масавага паходу на попел [illegible] ходзе прымуць удзел [illegible] кавалерыі, піянэры. Паходам будуць [illegible] усе вуліцы гораду.

Камсамольцы наведаюць прадпрыемствы, ЖАКТ'ы і т. д. Для [illegible] сабранага попелу саўгасы дадуць 30 фурманак. Каля 120 фурманак дадуць чырвонаармейскія часьці.

Увесь сабраны попел 24-га красавіка вечарам будзе нагружаны [illegible] вагоны і адпраўлены на Мар'іна[illegible] [illegible] саўгас імя 10-годзьдзя БССР і камуну «ВВА» для ўгнаеньня [illegible]

Арганізаваная сяўба ў калгасах Прапойшчыны

Індывідуальным сэктарам у раёне ніхто ня цікавіцца

На Прапойскім раёне Магілеўскае округі на сёньнешні дзень налічваецца 11 калгасаў, якія аб'ядноўваюць 707 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, што складае 10,4 проц. агульнай колькасьці двароў раёну.

У выніку выпраўленьня дапушчаных перагібаў, растлумачэньня артыкулу тав. Сталіна і апошніх дырэктыў партыі і ўраду, у радзе месц раёну адзначаецца новы прыліў у калгасы. Асабліва гэтаму спрыялі добра арганізаваныя выезды ў попе некаторых калгасаў. У калгас «Кастрычнік», напрыклад, улілося новых 40 гаспадарак, у калгас «Камунар»—15, у калектыў «Беларуская Вёска»—5 і г. д.

Там-жа, дзе партыйныя ячэйкі нічога не рабілі для выпраўленьня сваіх памылак і належным чынам не падрыхтаваліся да сяўбы, ня спыняецца адліў з калгасаў. Возьмем, напрыклад, калгас «Гарадзішча», які налічвае 32 гаспадаркі. Два дні калгасьнікі калектыўна працавалі ў полі, а на трэці дзень 14 гаспадарак выйшлі са складу калгасу. Тлумачыцца гэта тым, што мясцовыя работнікі ня прымалі ніякіх мер да замацаваньня калгасу і арганізацыі працы ў ім.

Наогул сяўба па калгасах ідзе добра.

На 18-е красавіка калгас «Кастрычнік» узараў 200 гэкт. і засеяў 13 гэкт. Калгас «Чырвоны Партызан» узараў 37 гэкт. і засеяў 7 гэкт. Калгас «Перамога» ўзараў 15 гэкт., засеяў—7,5 гэкт.

У калгасе «Кастрычнік» кожны дзень працуе ў полі 100 коняй, якія разьбіты на 10 брыгад. Кожная брыгада мае дзённае заданьне: узараць і засеяць дзённую плошчу. Загадчык паляводзтвам пэўную плошчу. Загадчык паляводзтвам пэўную плошчу. Кожны дзень аб'яжджае ўсе вёскі і кантралюе, як брыгадамі выконваецца заданьне.

Рабочыя пляны, якія былі складзены па 9-ці калгасах, часта парушаюцца таму, што кожны дзень ў калгасы ўступаюць новыя члены (у рэдкіх выпадках мае месца і адліў) [illegible] як колькасьць цягавай сілы, так і людзкой, а таксама і разьмер [illegible] кліну.

Няма пастаяннай дапамогі калгасам з боку агранамі, бо на [illegible] раён ёсьць усяго два агранамы. [illegible] акалічнасьці ў тэй ці іншай ступені адбіваюцца на пасьпяховым ходзе сяўбы ў калгасах.

Горшае чым у калгасах, [illegible] ў індывідуальным сэктары. [illegible] адзначыць, што ніхто наогул [illegible] і ня цікавіцца індывідуальным сэктарам.

Пляны папярэньня заседаў плошчы да асобнага двара не даведены. Крэдыты, вызначаныя для індывідуальнага сэктару, нескарыстаны. Апошняя пастанова ўраду «аб мерах [illegible] шэньня плошчы засеву індывідуальнымі гаспадаркамі» [illegible] слаба.

Брыгадзір «Зьвязды» ВОІНАЎ.

Папраўка

У артыкуле «У барацьбе супроць скрыўленьняў партыйнай лініі ў калгасным руху» зьмешчаным у «Зьвязьдзе» № 94 ад 22 красавіка ўкралася наступныя тэхнічныя аплошкі:

У 5-й калёнцы, 3-і абзац, у 8-9 радкох надрукавана «замацаваных калгасах», павінна быць «замацаваньне калгасаў».

У 7-й калёнцы, другі абзац, у 1-2 радкох надрукавана «рад паасобных памылак», павінна быць «паасобныя памылкі».

У гэтай-жа калёнцы ў тэхнічным абзацы, 5-м радку пасьля слоў: «На даным этапе» прапушчаны словы «ўзмацніўшы барацьбу супроць усякіх спроб заціску самакрытыкі».

Супроць антысавецкай кампаніі

ПАРЫЖ, 15. Група перадавой французкай інтэлігэнцыі, на чале з Роллянам, Деланьэй і іншымі, выпусьціла адозву, накіраваную супроць антысавецкай кампаніі, якая за апошні час у Францыі узмацнілася. У адозьве гаворыцца:

«Фабрыкацыя дакументаў, розныя хлусьлівыя выдумкі, скажэньні фактаў—усё пушчана ў ход. На зьмену кінематаграфічнаму раману Куцеаўшчыны зьяўляецца паход супроць так званых «рэлігійных праследаваньняў». Забараняюць продаж у кіёсках некаторых выданьняў, якія прыязна адносяцца да СССР, але затое дазваляюць публікацыю артыкулаў, якія зьяўляюцца простым заклікам **да забойства кіраўнікоў Савецкае дзяржавы і яе прадстаўнікоў.** У той-жа час дапускаюць [illegible] у Парыжы белагвардзейскай [illegible] дэмі і камандаваньня «расіі [illegible] та», адначасова адмаўляючы [illegible] жэньні візы буйнейшаму [illegible] но-рэжысэру **Эйзэнштэйну.** Ка[illegible] датычыць СССР, дык безабл[illegible] шаюцца ўсе правы і спр[illegible] апраўдываюць у Парыжы фа[illegible] фальшывых вэксалёў і у Бер[illegible] робшчыкаў чырвонцаў. Пал[illegible] жарыць усюды. Імперыялізм [illegible] наглее. Калі мы ня здолеем [illegible] та рэагаваць, як належыць, [illegible] немся або над фашысцкім [illegible] перад новай вайной».

Падрабязнасьці паўстаньня ў Чытагонгу

ЛЁНДАН, 21. З Бамбэю паведамляюць падрабязнасьці падзей у Чытагонгу. Напад быў арганізаваны групаю моладзі ў 100 чалавек. Былі перарэзаны тэлефонныя і тэлеграфныя правады і ў некаторых мясцох разбурана чыгуначнае палатно. Адна група напала на галоўнае кіраўніцтва Бэнгальскай чыгункі і забрала зброю і амуніцыю. Другая група ўварвалася ў паліцэйскую казарму, забіла вартаўнікоў, забрала зброю, амуніцыю і ўзарвала памяшканьне. У выніку сутычак былі забітыя два эўрапэйцы і 9 індусаў

Ангельска-Савецкі часовы гандлёвы дагавор

16-га красавіка ў Лёндане падпісаны часовы гандлёвы дагавор паміж СССР і Англіяй. Гэты дагавор складаецца з кароткай уступнай часткі ў 7-мі артыкулах. Да дагавору даданы два пратаколы. Акрамя таго адначасова з падпісаньнем пратаколу свацкі паўнамоцны прадстаўнік т. Сакольнікаў зрабіў дэкларацыю ад імя савецкага ўраду, а ангельскі міністар замежных спраў Гендэрсон зрабіў дзьве дэкларацыі і ўручыў т. Сакольнікаву ноту.

Ва ўступнай часьці дагавору гаворыцца, што ён будзе дзейнічаць аж да заключэньня пастаяннага дагавору, які абодва бакі жадаюць заключыць у магчыма карацейшым часе.

Артыкул 1-шы, у мэтах разьвіцьця і ўмацаваньня гандлёвых адносін паміж СССР і Англіяй, устанаўляе прынцып узаемнага спрыяньня. Згодна гэтага прынципу, усе ільготы і перавагі па гандлі, якія прадастаўлены або будуць прадастаўлены ў Англіі грамадзянам і арганізацыям якога-небудзь краю, тым самым пашыраюцца на савецкіх грамадзян і савецкія арганізацыі. Такое-ж правіла прыстасоўваецца і да ангельскіх грамадзян і арганізацый у СССР. Аднак, Англія ня можа пратэндаваць на тыя ільготы, якія СССР прадастаўляе дзяржавам што ўваходзілі да сустрэтнай вайны ў склад былой расійскай імпэрыі, або суседнім з СССР краінам у Азіі, або якой-небудзь іншай краіне, уваходзячай у мытны саюз з СССР.

Артыкул 2-гі, грунтуючыся на мананполі замежнага гандлю СССР, пастанаўляе, што савецкі гандлёвы прадстаўнік у Англіі і два яго намесьнікі будуць карыстацца правамі дыпляматычнай недатыкальнасьці. Такім жа правам будзе карыстацца і памяшканьне гандлёвага прадстаўніцтва.

Згодна гэтаго-ж артыкулу, савецкі ўрад прымае на сябе адказнасьць за ўсе зьдзелкі гандлёвага прадстаўніцтва, заключаныя ў Англіі, але не адказвае за дзейнасьці тых савецкіх гаспадарчых арганізацый, якія паводле законаў СССР самі адказваюць за свае дзейнасьці.

Артыкул 3-ці рэгулюе пытаньне аб суднаходзтве і парусным нортамі. Увага 1-я да гэтага артыкулу гаворыць, што ён не прадастаўляе суднам аднэй з старон, якія дагаварваюцца, права на лоўлю рыбы ў тэрытарыяльных водах другой страны: таксама ангельскія суды ня могуць патрабаваць прывілеяў, якія СССР прадаставіць рыбалоўным суднам дзяржаў, якія знаходзяцца на берагох Ледавітага акіяну.

Артыкулы 4, 5 і 6 прадугледжваюць парадак пашырэньня дзейнасьці дагавору на ангельскія дамініёны, калёніі і іншыя ўладаньні.

Артыкул 7-мы пастанаўляе, што дагавор набывае моц неадкладна і будзе дзейнічаць да ўступленьня ў сілу пастаяннага гандлёвага дагавору. Аднак, кожная з старон мае права заявіць аб сваёй адмове ад дагавору, які ў такім выпадку будзе дзейнічаць пачэ на працягу шасьці месяцаў пасьля зробленай заявы.

Што датычыцца дадаткаў да згоды, то першы пратакол пастанаўляе, што ў сваіх гандлёвых адносінах абодзьве стараны будуць кіравацца выключна камэрцыйнымі і фінансавымі меркаваньнямі. Таму да савецкіх зьдзелак у Англіі (як і да ангельскіх зьдзелак у СССР) ня будуць прыстасоўвацца ніякія нясправядлівыя абмежаваньні. У прыватнасьці, да савецкіх зьдзелак у Англіі павінны застасоўвацца тыя-ж правілы аб крэдытах, якія прыстасоўваюцца да зьдзелак усякай іншай краіны.

Згодна другога (дадатковага) пратаколу, гандлёвы прадстаўнік і яго намесьнікі ня будуць абараніцца сваімі дыпляматычнымі прывілеямі ў тых судовых справах, якія могуць узьнікнуць у сувязі з гандлёвымі зьдзелкамі, заключанымі гандлёвым прадстаўніцтвам.

Пры падпісаньні дагавору і пратаколаў, тав. Сакольнікаў зрабіў дэкларацыю аб тым, што СССР захоўвае за сабою права на ўсе судны былога расійскага флёту як ваенныя, так і гандлёвыя, якія былі ўласнасьцю расійскага ўраду або падлягаюць нацыяналізацыі паводле савецкіх законаў і якія былі ўведзены заграніцу бяз ведама і згоды савецкага ўраду, або якім небудзь інпым шляхам уникнулі фактычнага пераходу да савецкіх арганізацый.

Гендэрсон у сваю чаргу зрабіў дзьве дэкларацыі ад імя ўраду Паўднёва-Афрыканскага саюзу і ад імя Ірляндзкага ўраду аб тым, што да гэтых дамініёнаў не прыстасоўваецца прадугледжаны ў артыкулах 4 і 6 парадак пашырэньня дагавору на дамініёны.

Адначасова Гендэрсон уручыў т. Сакольнікаву ноту аб тым, што Ірляндзкі ўрад гатовы абмяняцца з савецкім урадам нотамі, якія ўстанавілі-б, на аснове найбольшага спрыяньня, часовы парадак гандлёвых узаемаадносін аж да заключэньня пастаяннага гандлёвага дагавору паміж Ірляндыяй і СССР.

Гэты часовы дагавор ёсьць толькі першы крок. У далейшым прадстаяць яшчэ перагаворы па радзе пытаньняў эканамічнага характару, па ўзаемных прэтэнзіях і г. д. Але і падпісаны акт мае вялізарнае міжнароднае значэньне.

Кожны рабочы Савецкага Саюзу павінен аддаць сабе справаздачу ў тым, што падпісаньне ангельска-савецкага гандлёвага дагавору ёсьць перш за ўсё вялікая перамога мірнае палітыкі Савецкага Саюзу. Вось ужо цэлы рад месяцаў, як пралетарыят СССР, а разам з ім рабочыя ўсіх капіталістычных краёў уважліва сочаць за разгортваньнем самай жорсткай, самай бессаромнай кампаніі імпэрыялістычных урадаў супроць СССР.

Гандлёвы дагавор СССР з Англіяй убіваецца клінам у адзіны антысавецкі фронт, растрайваючы авантурыстычныя замыслы найбольш злых ворагаў СССР.

Ангельска-савецкі гандлёвы дагавор зьяўляецца рашучым ударам па праваакацыйнай палітыцы нацкоўваньня, на агідных падкопах славутага Дэтэрдынга—ангельскага нафтавага караля, які працягвае свае брудныя лапы да нафтавых багацьцяў, якія належаць працоўным масам СССР, і які шалёна мабілізуе ўсе авантурыстычныя сілы імпэрыялізму супроць СССР пад знакам «крыжовага паходу» і падрыхтоўкі вайны з намі.

Зусім зразумела, што ўдар па Дэтэрдынгу, які наносіцца ангельска-савецкім гандлёвым дагаворам адначасова і ўдарам па авантурыстычнай антысавецкай палітыцы рэакцыйных пластоў буржуазнай Францыі.

Савецкі саюз, супроць якога вядзецца самае жорсткае цкаваньне, які акружаны кольцам імпэрыялістычнай нянавісьці, на клёпу і злосьці, атрымаў новую перамогу ў сваёй пралетарскай палітыцы міру. Гэтай перамогай, зразумела, ня трэба захапляцца. Мы ведаем і помнім добра, чаго варты запэўненьні імпэрыялістых у «начуцьцёж прыязьні» да СССР. Досыць успомніць іх паводзіны ў сувязі з канфліктам на К.-У. чыгунцы, іх антысавецкія махінацыі на Лёнданскай канферэнцыі «па разбраеньні», шалёны рост ваеннага забесьпячэньня імі Польшчы і Румыніі. Працоўныя СССР павінны паранейшаму пільна сачыць за імпэрыялістычнай антысавецкай кампаніяй, якая далёка яшчэ ня скончылася, каб быць гатовымі ў любую мінуту даць зьнішчальны адпор драпежнікам сусьветнага капіталу.

Узмоцнім падрыхтоўку працоўных да абароны краю

Праграма Камінтэрну канстатуе, што «галоўная і асноўная тэндэнцыя ў палітыцы імпэрыялістычных дзяржаў зьяўляецца тэндэнцыя да акружэньня СССР і да контр-рэвалюцыйнай вайны супроць яго з мэтаю яго задушэньня і стварэньня сусьветнага буржуазна-тэрыстычнага рэжыму».

Гэта тэндэнцыя ў цяперашні час, нават паводле прызнаньня буржуазных палітыкаў (Дмоўскі), ператвараецца ў рэальную пагрозу непасрэднага нападу на Савецкі Саюз.

Імпэрыялісты, страціўшы надзею на эканамічны (а, значыць, і палітычны) крах СССР, падганяныя перажываным імі ў даны час сусьветным крызісам, усі сілы, з д'ябальскай энэргіяй рыхтуюцца да вайны. Гэта падрыхтоўка вядзецца і ў ваенных, і ў дыпляматычных, і ў эканамічных, і ў палітыка-маральных адносінах. Барацей кажучы—гэта падрыхтоўка ахапляе ўсе бакі «унутраной» і «замежнай» дзейнасьці імпэрыялістычных дзяржаў ад нарады генштабаў у Варшаве, жульніцкіх судовых працэсаў у Нарыжы, да «маральных» дывэрсій «духоўнага» прадстаўніка сусьветнай біржы («сусьветнага камівояжэра», паводле выразу папа Дмоўскага) папы рымскага, дывэрсій, якія ўзмоцнена падтрымліваюць розных масьцей сацыял-дэмакраты. Усё ўзрастаючая подласьць сацыял-дэмакратыі — гэтага гончага сабакі імпэрыялістычных паляўнічых—зьяўляецца дасканалым довадам блізкасьці ваеннай буры, якая набліжаецца да СССР.

Трэба сказаць, што ў галіне непасрэднай падрыхтоўкі працоўных работа вядзецца надзвычай нязначная. Мы настолькі захоплены сацыялістычнай перабудовай нашай гаспадаркі, што часта забываем аб неабходнасьці забесьпячэньня гэтае гаспадаркі ад імпэрыялістычных драпежнікаў, як часамі забываем арганізаваць адпаведную варту нова-створанага калгасу ад кулацкіх падпалаў.

Само сабою зразумела, што асновай умацаваньня абароназдольнасьці нашага краю зьяўляецца пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва, якое ня толькі стварае патрэбную эканамічную і тэхнічную базу абароны, але і вядзе да ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў унутры нашай краіны, г. зн. зьнішчае заўсёднага ў нас яшчэ дагэтуль агента і саюзьніка сусьветнай буржуазіі. Але для пасьпяховага змаганьня з арміямі імпэрыялістых ў надыходзячай вайне гэтага мала. Высокая разьвітая і магутная тэхніка будучай вайны патрабуе, каб ёю ўладалі ўмелыя рукі. Будучая вайна патрабуе дасканала навучаных кадраў, яна патрабуе ня толькі ад камандзіраў, але і ад кожнага байца добрага веданьня тактычных прыёмаў барацьбы, высокага ўзроўню палітычнай сьвядомасьці і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўкі, высокага маральнага і фізычнага загартаваньня.

Ясна, што з такой падрыхтоўкай шматлікіх рэзэрваў, патрэбных для арміі ваеннага часу, ня здолее справіцца поўнасьцю наша надзвычай малалікая кадравая РСЧА. Усебаковая падрыхтоўка краю да абароны—справа ня толькі ваеннаведу, але і справа ўсіх савецкіх, партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. Матар'ялы, якія ў нас ёсьць, паказваюць, што на многіх нашых арганізацыях няма патрэбнай мабілізацыі ўвагі і актыўнасьці для вырашэньня канкрэтных, практычных задач ваеннай і ваенна-палітычнай падрыхтоўкі працоўных. Праўда, мы вядзем вялікую работу па выкрыцьці ваенных замыслаў імпэрыялістых, па выкрыцьці ваеннага находу, які падрыхтоўваецца імі супроць СССР; мы заклікаем працоўных да пастаяннай пільнасьці, але часта здавальняемся заявамі аб нашай рэвалюцыйнай гатоўнасьці, аб нашай рашымасьці даць належны адпор імпэрыялістым. Гэтага мала. Нам патрэбна дзейнасьць, нам трэба рашуча паставіць пытаньне аб практычнай рабоце па падрыхтоўцы працоўных да абароны. Іменна гэтага вымагае сучасная сітуацыя, «асноўным зьвяном якое зьяўляецца праблема ваенная небясьпекі», і іменна з гэтай канкрэтнай работай у нас ня ўсюды ўсё добра.

Шматлікія факты гавораць, што ў нас яшчэ ёсьць такія камсамольскія, прафсаюзныя і нават партыйныя арганізацыі, якія выносячы рэзалюцыі аб ваеннай рабоце, забываюць, што для пасьпяховай вучэбнай і выхаваўчай ваеннай работы, акрамя прыгожых рэзалюцый, патрэбны яшчэ і такія празаічныя рэчы, як ціры, вёрсты, баявыя рыштункі, спартыўныя і хэмічныя гарадкі, аўдыторыі, падручнікі, кіраўнікі і поўна акрэсьлены час.

Ад разважаньняў аб тым, што мы заўсёды гатовы выступіць на абарону рэвалюцыйных зваяваньняў, гутарак, за знадворнай рэвалюцыйнасьцю якіх часта хаваецца старое «шапкамі закідаем», часта хаваецца адзін з самых нікчэмных відаў апартунізму, які выпікае з недаацэнкі ваеннай небясьпекі. Ад гэтых разважаньняў мы павінны неадкладна перайсьці да практычнай арганізацыі работы па ўзмацненьні абароны паогул і ваеннай падрыхтоўкі працоўных у асаблівасьці. Апартунізму і нядбайнасьці ў пытаньнях ваеннай работы павінна быць абвешчана рашучая бязьлітасная барацьба.

Усебаковая падрыхтоўка працоўных да абароны зьяўляецца важнейшай рэвалюцыйнай і партыйнай работай. Той, хто гэтага не разумее, той нічога не разумее ў бальшавізьме, той не разумее і таго, што завяршыць нашае сацыялістычнае будаўніцтва мы зможам толькі пры ўмове забесьпячэньня абароны ад нападу імпэрыялістых.

Ад рэзалюцый і прыгожых плянаў, якія з прыемнасьцю ўхваляюцца многімі нашымі партыйнымі, прафсаюзнымі і асабліва камсамольскімі арганізацыямі, трэба бездакладна пераходзіць да пастаяннай, упартай (пабальшавіцку ўпартай) і марудной работы на ўкамплектаваньні вучэбна-страявых адзінак Асоавіяхіму, па матар'яльным забесьпячэньні вайсковай вучобы, да надбору сапраўды адказных партыйных кадраў для кіраўнічай асоавіяхімаўскай работы і да пастаяннага кантролю за гэтай работай. Асабліва трэба падцягнуцца нашым камсамольскім арганізацыям, якія да гэтага часу, відаць, слаба ўсьвядомілі, што падрыхтоўка маладога пакаленьня ваенна-пісьменных рэвалюцыйных байцоў—зьяўляецца важнейшай часткай інтэрнацыянальнага выхаваньня моладзі. Вайсковая падрыхтоўка працоўных, падрыхтоўка краю да абароны—зьяўляецца баявой задачай ня толькі Асоавіяхіму, але і ўсіх партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і інш. арганізацый.

І гэта баявая задача павінна выконвацца па-баявому.

М. ТЫМАНЮК.

ФРУНЗАЎСКІ РК ЛКСМБ СКЛІКАЕ КАНФЭРЭНЦЫЮ

беспартыйнай рабочай моладзі Фрунзаўскага раёну

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Удзел рабочай моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве (дакл. т. Будзінскі), 2. Суднакад РК (дакл. т. Старобінец), 3. Аб выторчна-бытавых камунах, (дакл. т. Харноў) і 4. Дакл. журнальнай камісіі па прысуджаньні пераходнага сьцягу ВСНГБ (дакл. т. Каждан).

Канфэрэнцыя пачынаецца 26-га красавіка ў 18 гадз.

у доме Працаўсіты (Камуністычная вул.)

Ячэйкі ЛКСМБ павінны зараз-жа на пашыраных сходах рабочай моладзі абраць делегатаў на канфэрэнцыю. Модус—1 ад 5.

28-га красавіка, а 10 гадз. адкрыецца пленум Менскага акругкому ЛКСМБ. Делегаты вясковых раёнаў павінны быць у Менску

ЗЬВЯЗДА.

Партыйнае будаўніцтва

Разгортваючы самакрытыку, хутка і рашуча выправіць памылкі

УСЯКАЯ СПРОБА АПРАЎДАЦЬ І ЗМАЗАЦЬ СВАЕ ПАМЫЛКІ ЁСЬЦЬ АБ'ЕКТЫЎНА БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ ЛІНІІ ПАРТЫІ

Узмацніць барацьбу з правым ухілам — галоўнай небясьпекай і з „левымі" загібамі

КНЯЖЫЦКАЯ ЯЧЭЙКА НА ШЛЯХУ АЗДАРАЎ ЛЕНЬНЯ

(МАГІЛЕЎШЧЫНА)

Княжыцкая парт'ячэйка пры правядзеньні калектывізацыі дапусьціла грубыя праваапартуністычныя скажэньні і «левыя» перагібы. Мясцовыя партыйцы стваралі калгасы пры дапамозе мэтадаў адміністрацыйнага націску. Ніякай папярэдняй работы сярод батрацтва і беднаты не праводзілася. Ячэйка лічыла, што даволі некалькіх афіцыйных пастаноў і загадаў, каб Княжыцкі сельсавет быў калектывізаваны.

Не правёўшы ніякай падрыхтоўчай работы, не згуртаваўшы батрацка-бядняцкага ядра, княжыцкія партыйцы прыступілі адразу да раскулачваньня. Ня дзіва, што раскулачваньне ператварылася ў адміністрацыйную канфіскацыю кулацкае маемасьці і толькі. Беднота і серадняцтва стаялі ў баку. Пры гэтым ячэйка, ня толькі праводзіла раскулачваньне кулацкіх гаспадарак, але і выкінула лёзунг «ліквідацыі местачковых нэпманаў і гандляроў». У сельсавеце пры дапамозе міліцыянэраў і іншых адміністрацыйных работнікаў «раскулачваліся» мясцовыя гандляры і нэпманы. У гэтым напрамку асаблівую актыўнасьць праявіў Княжыцкі сельсавет. Сельсаветчыкі ў масавым парадку правялі канфіскацыю ўсяе маемасьці ў местачковых гандляроў. Потым, на дапамогу сельсавету прыйшоў і Магілеўскі райвыканком. Старшыня райвыканкому Ціманенка дакладна праінструктаваў сельсаветчыкаў аб парадку скарыстаньня канфіскаванае маемасьці.

Ячэйка з свайго боку дапусьціла злачынае скажэньне партыйнай лініі пры абагуленьні ў калгасах скаціны і пасеньня. Парт'ячэйка шляхам адміністрацыйных загадаў прымушала калгасьнікаў абагульваць усю скаціну. Калі-ж частка калгасьнікаў адмовілася гэта зрабіць, дык ячэйка знайшла просты «выхад». Яна пастанавіла стварыць спэцыяльную групу з настаўніцтва і вучняў пры дапамозе якое абагуліць усё насеньне і скаціну. Аб тым, каб арганізаваць батрацка-бядняцкае ядро, каб правесьці абагуленьне рабочае скаціны пры дапамозе бядняцка-серадняцкага калгаспага актыву, ячэйка нават но падумала. Гэта не зьяўляецца выпадковым. Партыйная ячэйка ўвесь час груба ігнаравала самадзейнасьць батрацка-бядняцкіх мас і пальцам не паварушыла, каб правесьці хаця-б якую-небудзь работу сярод беднаты і батрацтва.

Па сутнасьці ўся работа ячэйкі па калектывізацыі зьяўлялася бязглуздай гульнёй у калгасы. Ячэйка толькі імкнулася арганізаваць калгас. Такія-ж пытаньні як унутраное ўмацаваньне калгасу, арганізацыя працы і вытворчасьці, падрыхтоўка калгасу да веснавой сяўбы, — менш за ўсё цікавілі ячэйку. Ячэйка, напрыклад, нічога не зрабіла па арганізацыйным і гаспадарчым замацаваньні Княжыцкага калгасу. У гэтым калгасе расквітнелі безгаспадарчасьць, нядбайнасьць і г. д. Кіраўнікі калгасу дапускалі грубыя перагібы, прымушалі цалкам абагульваць усю маемасьць і г. д.

Раённае парткіраўніцтва спакойна праходзіла міма ўсіх гэтых фактаў. Райком ня ўжыў ніякіх мер, каб аздаравіць кіраўніцтва Княжыцкай ячэйкі і ліквідаваць скрыўленьні партыйнай лініі, дапушчаныя ў сельсавеце. РК нават не рэагаваў на тое, што ячэйка потым не хацела і супраціўлялася выпраўленьню сваіх памылак. Пасьля апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) і артыкулу т. Сталіна як партыйная ячэйка, так і раённае парткіраўніцтва не перабудавалі сваёй работы і нічога не зрабілі, каб выправіць дапушчаныя грубейшыя скажэньні і перагібы.

Нядаўна бюро Магілеўскага акругкому КП(б)Б і прэзыдыум АКК абмеркавалі пытаньне аб парушэньнях партыйнай лініі пры правядзеньні калектывізацыі ў Княжыцкім сельсавеце, Магілеўскага раёну. Бюро АК і прэзыдыум АКК распусьцілі бюро Княжыцкай парт'ячэйкі за правядзеньне яўна праваапартуністычнай лініі. Сакратар Княжыцкай ячэйкі выключаны з партыі. Бюро АК і прэзыдыум АКК пастанавілі датэрмінова перавыбраць Магілеўскі раённы камітэт партыі, які ня справіўся са сваімі асноўнымі задачамі. Сакратару РК абвешчана суровая вымова. Абвешчана суровая вымова фракцыі райвыканкому. Прыцягваюцца да адказнасьці ўсе работнікі, дапусьціўшыя скажэньні і перагібы.

Акругком партыі завастрыў увагу усёй Магілеўскай раённай партарганізацыі на патрэбнасьці хутка і рашуча ліквідаваць дапушчаныя перагібы, выправіць памылкі і разгарнуць сапраўдную работу па калгасным будаўніцтве на падставе дырэктыў партыі.

П.

ПРЫЗНАЕМ СВАЕ ПАМЫЛКІ

Пленум Магілеўскага АК цалкам ухваляе пастанову бюро ЦК КП(б)Б

Аб'яднаны пленум Магілеўскага АК і АКК КП(б)Б заслухаў інфармацыю тав. Рыжова аб пастанове бюро ЦК КП(б)Б па пытаньні аб палітычных памылках акруговага парткіраўніцтва і прарывах у рабоце партарганізацыі.

Пленум цалкам і поўнасьцю ўхваліў пастанову Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і прыняў дырэктывы і задачы, паказаныя ў гэтай пастанове да няўхільнага выкананьня. Ва ўхваленай рэзалюцыі аб'яднанага пленуму АК і АКК КП(б)Б, між іншым, гаворыцца:

— Аб'яднаны пленум АК і АКК КП(б)Б прызнае памылковай пастанову студзеньскага пленуму АК аб «ліквідацыі новай буржуазіі, як клясы», якая (пастанова) разыходзіцца з лініяй партыі. Пленум лічыць таксама памылковай пастанову бюро АК КП(б)Б аб зьніжэньні на 25 проц. норм зямлякарыстаньня.

Пленум асудзіў рад іншых палітычных памылак бюро АК КП(б)Б, дапушчаных бюро ў Шклоўскай, Крычаўскай, Чэрыкаўскай справах і г. д. Пленум заклікаў усю партыйную арганізацыю да рашучай і безадкладнай ліквідацыі дапушчаных перагібаў і скрыўленьняў партлініі і да поўнага і хуткага выпраўленьня памылак.

На словах і на справе

(ВІЦЕБШЧЫНА)

Рад партыйных ячэек Чашніцкай арганізацыі КП(б)Б ігнаруюць дырэктывы партыі аб рабоце сярод батрацтва і беднаты. Некаторыя парт'ячэйкі праводзяць яўна праваапартуністычную лінію, праяўляючы недапушчальную пасыўнасьць у рабоце сярод батрацка-бядняцкіх мас. У раённай арганізацыі ўхвалена ня мала прыгожых пастаноў, у якіх рашуча завастраецца пытаньне аб рабоце з батрацка-бядняцкімі масамі. Але далей пастаноў справа ня ідзе. Практычная работа кульгае на абедзьве ногі. Яшчэ вусім нядаўна, у мінулым месяцы, раённы партсход ухваліў рэзалюцыю аб рабоце сярод батрацтва і беднаты. Рэзалюцыя дзелавая, канкрэтная з правільнай у асноўным палітычнай устаноўкай. У ёй ёсьць пункт аб тым, каб у месячны тэрмін арганізаваць батрацка-бядняцкія групы, а таксама разгарнуць шырокую работу па ўцягненьні батракоў у калгасы. На жаль, гэта рэзалюцыя ня выконваецца.

Цяпінская парт'ячэйка, напрыклад, не арганізавала ні адной батрацка-бядняцкай групы. Гэта ячэйка літаральна нічога не рабіла па арганізацыі батрацтва і беднаты, накуль з раёну ня прыехаў член бюро РК і асабіста не арганізаваў групу беднаты пры КСУ. Пры мясцовым-жа калгасе група беднаты ня створана і дагэтуль.

Камуністыя камуны «Чырвоны Барацьбіт» ня лепш праводзяць работу сярод батрацтва і беднаты. Проста кажучы, яны ў гэтым напрамку бязьдзейнічаюць.

Бязьдзейнасьць партыйных ячэек скарыстоўваюць кулацкія элемэнты. Яны разгортваюць шалёную антыкалгасную прапаганду сярод бядняцка-серадняцкіх мас. Ячэйкі несвоечасова, нерашуча і невыстарчальна даюць адпор кулацкай агітацыі. Ня дзіва, што ў радзе калгасаў беднякі і сераднякі, з'агітаваныя варожымі элемэнтамі, пачалі падаваць заявы аб выхадзе з калгасаў.

Т—н.

УДАРНІКІ ЎСТУПАЮЦЬ У ПАРТЫЮ

Партыйны калектыў фабрыкі «Кастрычнік» (Менск) разгарнуў вялікую работу па вярбоўцы перадавых рабочых і работніц у свае рады. За апошні час парткалектыў прыняў у партыю 90 рабочых і работніц. Усе яны прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве і зьяўляюцца ўдарнікамі. Нядаўна ў цэхавыя парт'ячэйкі яшчэ 70 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Пры фабрыцы створаны гурткі па палітычным выхаваньні новых кандыдатаў. Асноўная маса рабочых і работніц, прынятых у партыю, глыбока зацікавілася работай гэтых гурткоў. Наведваюцца палітгурткі вельмі добра.

Парткалектыў не абмежаваўся толькі тым, што ўцягнуў партыйнай закліку 1930 году ў работу паліткружкоў і палітгурткоў. Калектыў вядзе самы суровы і пастаянны вучот нагрузкі новых камуністых. Таму амаль усе рабочыя і работніцы, уцягнутыя ў партыю, маюць поўную партыйную нагрузку і прымаюць актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце. Усёй работай па выхаваньні кандыдатаў кіруе спэцыяльны сэктар, створаны пры бюро фабрычнага парткалектыву.

На фабрыцы практыкуецца скліканьне нарад кандыдатаў па ўсіх пытаньнях партыйнай работы на вытворчасьці.

Р.

Працэс шпіёнаў і шкоднікаў з канцэсіі „Ленагольдфільдс"

На трэці дзень працэсу групы беларгвардзейцаў, шпіёнаў і шкоднікаў, якія зьвілі сабе гнязда ў кіруючых органах канцэсіі «Лена-Гольдфільдс» пры допыце абвінавачанага Башкірцава, былога дзесятніка Рыдзьдзераўскага камбінату, на першы плян нечакана высунуўся заставаўшыся раней у цені «скромны ангельскі геалёг — інжынэр Ів.

Праўда, яшчэ ў паказаньнях Калясьнікава адзначалася, што Ів «атрымліваў нелегальным шляхам розныя весткі з савецкіх устаноў», але тое, што далося ўстанавіць адносна яго пры допыце Башкірцава, кінула новае сьвятло на яго «работу» і паказала, што тут мы мелі справу ня са звычайным шпіёнам-шкоднікам, якімі акружалі сябе Іваноў і Малаземаў, а з буйным драпежнікам, «спэцыяльнасьцю» якога была, відавочна, арганізацыя дывэрсыйных актаў, замахаў, падпалаў і т п «апэрацый» вялікага маштабу.

Для гэтага ён падбіраў сабе адпаведных выканаўцаў. Адным з іх і быў Башкірцаў.

Да рэвалюцыі Башкірцаў служыў вагадчыкам у іркуцкай турме, прымаў удзел у зьбіваньнях і забойствах зьняволеных, а пры Калчаку ўласнымі рукамі вешаў рабочых і камуністых.

Даведаўшыся аб яго контр-рэвалюцыйным мінулым і аб тым, што ён ледзе засуджаных па справе аб шкодніцтве ў золата-плятынавай прамысловасьці Лесьсіга і Гушцова, Ів запрапанаваў Башкірцаву — за грашовую ўзнагароду і прадастаўленьне службы з добрым акладам у канцэсіі—спаліць толькі што пушчаную ў ход новую абагачальную цынка - сьвінцовую фабрыку камбінату Рыдзьдзер-Цынк у Рыдзьдзеры.

Башкірцаў прыняў гэту прапанову 31 жніўня, захапіўшы з дому запалкі, дынамітную сьвечку і бікфордаў шнур, ён пералез праз плот каля брамы Сакольскае капальні, узяў закапаны там раней бідон з газаю і, карыстаючыся праходзіўшай зьменай рабочых, калі на яго ніхто не зварачаў увагі, зрабіў падпал.

Гэтым пажарам фабрыка зусім абсталяваньнем была зьнішчана дашчэнту. Апрача таго, агонь перакінуўся на штабэлі коксу, якія гарэлі пасьля таго яшчэ цэлы месяц.

Так афармілася «геалёгічная» дзейнасьць інжынэра Іва ў межах Савецкага Саюзу.

Наогул савецкім прадпрыемствам Ів уделяў больш увагі, чым сваім непасрэдным абавязкам на службе на канцэсіі. Знаходзячыся ўвесь час у разьездах, ён ніякіх дзеланых заданьняў для канцэсіі ня выконваў. Аб гэтым гаворыць і абвінавачаны Калясьнікаў і сьведка, супрацоўнік канцэсіі, інжынэр Мычолкін.

Першы расказвае, што будучы ў Лёндане, ён зазначаў Іванову на тое, што Ів нічога ня робіць і толькі «суе ўсюды свой нос», але Іваноў адказаў на гэта: «Пакіньце яго, ён карысьтаецца тут асаблівым довер'ем і займаецца іншай работаю, палітычнага значэньня».

Такі-ж адказ атрымаў і Мычолкін, які спытаўся аб прычынах бязьдзейнасьці Іва ў Малаземава.

— Ну, ён мае асобныя заданьні,— адказаў яму Малаземаў.

Як цяпер выявілася, гэтыя «асобныя заданьні» Ів выконваў не без посьпеху.

Яскравае сьвятло на ўсю гэту справу кідае паказаньне падсуднага Калясьнікава на тое, што «вышукаў Іва і прыняў яго на службу ў канцэсію Іваноў, той самы Іваноў, адносна якога нам вядома, што ён зьяўляецца, самым актыўным членам контр - рэвалюцыйнай эміграцыкай арганізацыі «Торгпром» і супрацоўнікам вядомай ангельскай установы «Інтэліджэнс Сэрвіз».

(«ИЗВЕСТИЯ»).

За 40-тысячны тыраж „Зьвязды"

Выклік Асіпавіцкага парткалектыву

Парткалектыў АСІПАВІЦКАГА ЧЫГ. ВУЗЛА на сваім апошнім сходзе прыняў пастанову аб 100-процантнай падпісцы членаў і кандыдатаў партыі на газ. «Зьвязда».

Сход адзначыў вялізарную ролю органу ЦК КП(б)Б—газ. «Зьвязда» ў пытаньнях партработы і далейшага сацбудаўніцтва Савецкай Беларусі.

Парткалектыў ст. Асіпавічы выклікаў на сацспаборніцтва, на 100-процантную падпіску на газ. «Зьвязда» наступныя парткалектывы: Жлобінскі, Гомельскі, Калінкавіцкі чыг. вузлы і парткалектыў Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату.

Аб найнавейшай эвалюцыі трацкізму

(На дакладзе тав. Ем. Яраслаўскага ў Камакадэміі)

(Ад нашага Маскоўскага карэспандэнта)

Ня спыняючыся на эвалюцыі, якую трацкізм прарабіў у працягу 25-ці год свайго існаваньня, дакладчык адзначае, што трацкізм прабаваў адыгрываць самастойную ролю ў рэвалюцыйным рабочым руху, але яе нідзе не адыгрываў. Трацкізм то набліжаўся да меншавізму, то аддаляўся ад яго, то маскаваўся пад яго, але заўсёды быў аднэй з розкавілнасьцяй меншавізму. Уваходзячы ў бальшавіцкую партыю, трацкізм імкнуўся захаваць сябе як самастойную клікі унутры партыі. Сам Троцкі ня раз гаварыў сваім бліжэйшым паплечнікам, што трэба берагчы свае кадры.

Што-ж зьяўляецца характэрным для трацкізму, як меншавіцкай сацыял-дэмакратычнай плыні?

Ленін ня раз характарызаваў трацкізм, як «барскі анархізм». Трацкізм ніколі ня меў апоры ў масах. Ён жыў заўсёды верхавінымі камбінацыямі. Яго арганізацыйным лёзунгам было — «хыві і жыць давай другім». Ня маючы ніколі апоры ў масах, Троцкі адносіцца да масы з пагардаю, глядзіць на яе з вышыні. Характэрна, як Троцкі расцэньвае зараз масавае ўваходжаньне пралетараў у партыю. У артыкуле пад загалоўкам «Эканамічны авантурызм і яго небясьпекі», зьмешчаным у «Бюлетэнях апазыцыі», Троцкі гаворыць, што заклікі (ленінскі набор і інш.) развадняюць партыю. У сваіх апошніх артыкулах, гаворачы аб суцэльнай калектывізацыі, ён піша, што партыя «суцэльную калектывізацыю на вёсцы дапаўняе суцэльным уключэньнем у партыю цэхаў і заводаў — авангард растваравецца ў клясе».

Не гаворачы ўжо аб тым, што тут Троцкі паклёпнічае на партыю, бо ніадзе і ніколі ня ўжывалася суцэльнае ўцягненьне ў рады партыі цэлых заводаў, што партыя ўжывае строга індывідуальны падыход да кожнага, жадаючага ўступіць у яе рады, характэрна тое, што Троцкі пераадвае масы пралетарыяту разглядае, як ваду. Колькі тут панскае пагарды да масы. Цікава, што-б сказаў Троцкі, калі-б гэтыя масы пайшлі за ім. Вядома, ён не пабаяўся б [illegible], каб выказаць Але масы за ім ніколі ня ішлі і ня пойдуць. Такім чынам, пагардная тэрміналёгія Троцкага аб растваральні, аб разваднёньні партыі і г. д.— ні што іншае, як злосьць бясьсільля.

Адрыў ад мас, адсутнасьць апоры ў перадавых пластох пралетарыяту, адлюстраваньне ўплываў гарадзкой дробнай буржуазіі — вось крыніца настаянных хістаньняў Троцкага, яго «тупымскіх пералётаў», як гаварыў Ленін, стварэньня беспрынцыповага жнівеньскага блёку і г. д.

Палітычная беспрынцыповасьць трацкізму асабліва ярка выявілася ў поглядах Троцкага на прыроду савецкае дзяржавы з таго моманту, як ён кандзяржавы ў дыхадзіць у лягер меншавізму. У пэрыяд перад 15 зьездам партыі Троцкі, як вядома, гаварыў аб тэрмідоры, аб спаўзаньні да тэрмідору. Праўда, гэта ня было вынаходкай Троцкага, гэта ня было вынаходкай Троцкага, —гэту «тэрмідарыянскую» тэорыю ён запазычыў ад Каўцкага і Мартава. Але тым ня менш ён у сваіх апошніх кнігах паранейшаму абараняе свае аўтарскае права на «тэрмідор». Пасьля 15-га зьезду ён пісаў, што улада ў СССР цэнтравана ў руках «бюракратычскацэнтравана ў руках «бюракратычных органаў, якія апіраюцца на рабочую клясу». Праз некаторы час у яго зьявілася новая тэорыя «аб двухуладзьце»: улада падзяляецца паміж адсталай часткаю (!) пралетарыяту і сярэдняй часткаю (!) пралетарыяту і сярэдняга сялянства, г. зн. дробнай буржуазіі. А некалькі пазьней ён пісаў, што улада ўжо ў некаторай ступені перайшла ў рукі... буржуазіі.

У кастрычніку 1928 году ў сваім лісьце з Алма-Ата Троцкі гаварыў: «імена цяпер край перажывае керакшчыну навыварат» Гэтым ён хацеў сказаць, што калі керанчына азначала паступовае спаў

На Бабруйскім камбінаце

Высокая тэхніка і нізкая якасьць работы

Дзесяткі вытворчых недахопаў, якія можна легка зьнішчыць, б'юць па прамфінпляне

Пачаць бязьлітасную барацьбу з канкрэтнымі віноўнікамі зрыву плянавых заданьняў

ХВОРЫ НЭРВ БАБРУЙСКАГА КАМБІНАТУ

Яшчэ раз аб электрастанцыі

Электрастанцыя Бабруйскага камбінату працуе ўжо каля 8 месяцаў, але дагэтуль ня мае свайго вытворчага плану. Ня толькі радавыя рабочыя, але нават і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал ня ведаюць аб колькасьці выпускаемай прадукцыі (выпрацоўцы электраэнэргіі, пары), ня ведаюць аб сабекошце сваёй прадукцыі. Паводле кашторысу, сабекошт аднэй кілёват-гадзіны прадугледжаны ў 3½ кап. Цэхам электрастанцыя адпускае энэргію арыентовачна па 4½ кап. кілёват-гадзіна. Але самі працаўнікі станцыі кажуць, што яны «путром адчуваюць», што энэргія каштуе станцыі значна даражэй. У чым-жа справа? Справа ў тым, што на станцыі да гэтага часу не ўстаноўлены кантрольныя прыборы (вадамеры, парамеры і інш.), з прычыны чаго нельга ўстанавіць колькасьці выпусканае пары і энэргіі і іх сабекошту.

Прыборы павінна ўстанавіць «Тепло и Сила». Даставіць прыборы павінен Лесбел. Увесь час у гэтым пытаньні ідзе бесьперапынная перапіска, але толку мала. Калі прыбудуць фасонныя часткі для прыбораў — і сёньня невядома.

У катлох—шмат недахопаў. Паддувалы падымаюцца на звычайных вяроўках, якія часта рвуцца. Паддувалы недаюць і могуць забіць рабочых, якія вычышчаюць попел. І па гэтай справе ўвесь час ідуць перагаворы паміж кіраўніцтвам камбінату і «Тепло и Сила», каб паладзіць блёкі для пад'ёму паддувал

Пры чыстцы бункароў, іскры нясуцца па ўсёй кацёльнай, а мер супроць гэтага ня прынята.

Сыгналізацыя наводанасоснай станцыі не функцыянуе. «Тепло и Сила» абяцае адрамантаваць, але пакуль што нічога ня зроблена.

Каля 8 месяцаў працавала топка катла «Борзіг» і толькі цяпер «Тепло и Сила» зрабіла вывад, што топка не прыстасавана да работы на камбінатскім апале (пілавіньне, адкіды фанэрнага цэху).

Транспартэр для дастаўкі апалу на станцыю не ўстаноўлены, бо завод «Энэргія» ніяк ня можа выканаць заказу на патрэбныя камбінату часткі.

Качагараў, якія працуюць ля новых катлоў, не інструктуюць і яны часта ня ведаюць, дзе якая шрубка знаходзіцца.

«Тепло и Сила» паводле дагавору ўзяло па сябе абавязак інструктаваць рабочых камбінату, як скарыстоўваць новае замежнае абсталяваньне, але «Тепло и Сила» свайго абавязку ня выконвае.

Зараз на электрастанцыі ідзе мантаж другога турба-генэратара і 4-га катла. Работа гэта павінна быць скончана да 15-га чэрвеня бягучага году, але работа ідзе вельмі марудна. Няма ўпэўненасьці, што работа будзе скончана ў тэрмін.

Паогул трэба адзначыць, што ўзаемаадносіны паміж працаўнікамі камбінату і «Тепло и Сила» далёка непармальныя. Адчуваецца нейкая педагаванасьць. Гэта вельмі шкодна адбіваецца на рабоце электрастанцыі.

Брыгадзір «Зьвязды» А. МАГІДАЎ.
Брыгадзір ЦСПСБ С. ГОЛЬДБЭРГ.
Члены ЧКК—МАКС, КА[illegible]Ч, РАМАНЧУК.

Рабкоры камбінату аб фанэрным цэху

Тры недахопы

Адзін з буйнейшых недахопаў у рабоце фанэрнага цэху—гэта вялікі запал абрэзанай фанэры ў калённай залі. Гэты недахоп можна зьнішчыць, даўшы кожнаму сартавальшчыку максымальную норму, каб паскорыць сартаваньне фанэры.

Другі недахоп—гэта тое, што лучнікі не апрацоўваюць бярэньніц да канца. Рэшткі прыходзяцца перавозіць з месца на месца і часта дадаткова абразаць.

Трэці недахоп—няма ваганэтак. З гэтай прычыны часта прыходзяцца надвозчыкам стаяць без работы.

Ня гледзячы на тое, што адміністрацыя таксама ведае аб гэтых недахопах, яна адносіцца да іх досыць фармальна.

М. Хэсдан.

Няма нагляду

У фанэрным цэху няма тэхнічнага нагляду. Таму часта бываюць непаразуменьні з выпрацоўкай шпонаў. Замест выпуску шпонаў у 1,12 мілім., мала кваліфікаваныя рабочыя выпускаюць шпоны у 1,4 мілім.

Адсутнасьць нагляду адбіваецца і на працадысцыпліне. Ёсьць выпадкі гультайства, сымуляцыі, асабліва сярод новых рабочых.

Лушчыльныя варштаты ня маюць сваіх інструмантаў. Між тым, кожнаму варштату патрэбны малаткі, зубілы і інш., а ў фанэрным цэху ўсяго два малаткі. Прыходзіцца рабочым часта ваганяцца за малаткам і спыняць работу варштату.

Аб рацыяналізацыі адміністрацыя мала думае. Бываюць выпадкі, калі рабочы ідзе дамоў, бо яму няма чаго рабіць. Ёсьць факты, калі на рабоце, дзе патрэбен адзін рабочы, працуюць два (у лушчыльным аддяленьні, на адносцы браку).

Сярод новых рабочых няма ніякай культурна-выхаваўчай работы. Некаторыя ня ведаюць, што такое прамфінпляны, ня ведаюць сваёй нормы выпрацоўкі і г. д.

Рабкор Койфман.

Адміністрацыя і ў вус ня дзьме

У фанэрным цэху рабочыя часта скарыстоўваюцца без уліку сапраўднай патрэбнасьці ў рабочай сіле. Звычайнае явішча, калі дзесятнікі ставяць падзенных рабочых, не пацікавіўшыся тым, ці ёсьць для іх работа, ці не. Падзенны рабочы можа ўвесь дзень прасядзець, толькі-б ён быў на вуцоце ў дзесятніка.

Якасьць работы малых варштатаў—дрэнная. Пры клейцы палова шпонаў выкідаецца. Аб гэтым ня раз гаварылі адміністрацыі, але яна не звяртае ўвагі.

Нікіцін.

Механізацыя дыбам

Больш усяго скаргаў у фанэрным цэху выклікае ўнутраны транспарт. Усяго ў цэху ёсьць 5 ваганэтак. З прычыны нястачы ваганэтак каля кожнага варштату кожны паўгадзіны бываюць 5-цімінутныя прастоі. Сярод рабочых даходзіць да скандалаў, таму, што кожны стараецца вабраць у другога ваганэтку.

Характэрна, што за ўвесь час работы цэху (больш 7-мі месяцаў) было прыблізна 15 вытворчых нарад. На кожнай нарадзе гаварылі аб ваганэтках. Рабочыя таксама не прапускалі ні аднаго сходу, каб не ўспамянуць аб ваганэтках. Між тым, нават яшчэ няма і чутак аб мерапрыемствах да паляпшэньня гэтага становішча.

За тое кіраўнікі камбінату не пашкадавалі закупіць такія машыны, якія камбінату вусім непатрэбны. Многія машыны купілены за межамі, каштуюць вялікіх грошай, а карысьці ня прынесьлі нават і на капейку. 6 месяцаў праляжалі яны мёртвым каштаванам пакуль не заіржавелі. Такім чынам папсаваліся дзьве цыркуляркі, прэс для сядзеньняў, прэс для дубу, стругальныя варштаты і інш. машыны.

УДАРНІК.

Замест аднаго працуюць 4

Лушчыльнае аддзяленьне фанэрнага цэху, ад якога залежаць усе іншыя працэсы вытворчасьці, кепска спраўляецца са зьніжэньнем сабекошту. Віна за гэта падае на дрэнная кіраўніцтва часткі майстроў.

Малыя лушчыльныя варштаты, якія выразаюць шпоны для фанэры-налавінак, кепска скарыстоўваецца, што памяншае колькасьць шпонаў на кубамэтр драўніны. Паводле штату на кожны малы лушчыльны варштат патрэбен адзін бракер, а працуюць два.

Транспартэр па скарацію колькасьці рабочых: на адносцы браку заместаднаго рабочага працуе чатыры.

Бракер, у абавязкі якога ўваходзіць дастаўка кражаў у лушчыльнае аддзяленьне, кепска адносіцца да справы. У цэх дастаўляюцца маламеркі, якія адпраўляюцца назад.

Брыгадзіры «Зьвязды»—ЗАЙДМАН, КОРНЕЙ, ВІНІК.

І заява не дапамагла

У канцарэзках, дзе абразаюць фанэру, такі пыл, што пасьля работы рабочага нельга пазнаць—ён увесь аблеплены тоўстым пластом пылу. Праўда, ля канцарэзак ёсьць спэцыяльны пылосос, але ён працуе толькі для вока. Усе лучнікі пылососу забіты пылам, ня гледзячы на тое, што ніво многа разоў прычышчалі. У чым-жа справа? А справа ў тым, што ў пылососе паламаны ўсе трубы і таму няма цягі.

Ня раз аб гэтым гаварылі адміністрацыі, нават заяву падавалі мэханіку фанэрнага цэху, але мер ніхто ня прымае.

Праходжы.

15 ДЗЁН УДАРНАЙ РАБОТЫ

РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ ФАНЭРНАГА ЦЭХУ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЦЯЖКІЯ ЎМОВЫ ПРАЦЫ (АДСУТНАСЬЦЬ ЎНУТРЫ - ЦЭХАВАГА ТРАНСПАРТУ, ДРЭННАЯ ПАДЛОГА, ДРЭННЫЯ МЭХАНІЧНЫЯ НОЖНІЦЫ І ІНШ.) УСЕ-Ж З ПОСЬПЕХАМ ВЫКОНВАЕ ПРАМФІНПЛЯН.

ЗА 15 ДЗЁН КРАСАВІКА ВЫТВОРЧАЯ ПРАГРАМА ВЫКАНАНА НА 97,8 ПРОЦАНТАЎ: ЗАМЕСТ 1.050 ПРЭСАЎ ФАНЭРНЫ ЦЭХ ВЫПУСЬЦІЎ 1.027 ПРЭСАЎ. НЕДАВЫПРАЦОЎКА ЗДАРЫЛАСЯ З ПРЫЧЫНЫ ТАГО, ШТО 2-ГА КРАСАВІКА ЦЭХ МЕЎ 4-ХГАДЗІННЫ ПРАСТОЙ ПА ВІНЕ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ І ПОТЫМ 8-МІГАДЗІННЫ ПРАСТОЙ ПРЭСУ Ў СУВЯЗІ З ЗАМЕНАЙ МАНЖЭТУ. (ЗА ГЭТЫ ЧАС НЕДАВЫПРАЦОЎКА СКЛАДАЛА 29 ПРЭСАЎ, Г. ЗН., ШТО КАЛІ-Б НЯ БЫЛО ПРАСТОЮ, ПРАГРАМА БЫЛА-Б ПЕРАВЫКАНАНА).

УСЕ-Ж ТРЭБА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО, ДЗЯКУЮЧЫ ЎДАРНАМУ ТЭМПУ РАБОТЫ, ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН БУДЗЕ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ВЫКАНАН. АЎ ГЭТЫМ СЬВЕДЧЫЦЬ НАПРУЖАНАЯ РАБОТА ЗА АПОШНІЯ ТРЫ ДНІ, КАЛІ ПЛЯН БЫЎ ПЕРАВЫКАНАНЫ НА ДЗЕВЯЦЬ ПРЭСАЎ.

САБЕКОШТ У ПАРАЎНАНЬНІ З САКАВІКОМ ЗА 15 ДЗЁН КРАСАВІКА ЗЬНІЖАНЫ НА 21 ПРОЦ.

ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ЎЗЯЦЦА ЗА ЗЬНІШЧЭНЬНЕ НЕДАХОПАЎ У РАБОЦЕ ЦЭХУ, АСАБЛІВА АДРАМАНТОЎКА ПАДЛОГУ (ЗРОБЛЕНАЯ З МЯККАГА АСЬФАЛЬТУ, ПАДЛОГА, З НАСТУПЛЕНЬНЕМ ЦЁПЛЫХ ДЗЁН, РОБІЦЦА ЯШЧЭ БОЛЬШ МЯККАЙ І ПЕРАШКАДЖАЕ РАБОЦЕ).

І. Д.

Недапушчальна павольна загатаўляецца бульба

Яшчэ ня выканан плян адгрузкі бульбы за сакавік

Наркамгандаль 18-га красавіка паслаў усім аргандлям тэлеграму, у якой прапанаваў тэрмінова адказаць, як праходзіць работа выпучаных троек па ўзмацненьні загатовак бульбы. На сёньнішні дзень на гэту тэлеграму прыслалі адказ толькі дзьве акругі—Аршанская і Менская. Адказы акруг сьведчаць аб тым, што ДАЛЕЙ ГУТАРАК І АГУЛЬНЫХ СЛОЎ МЕСЦЫ НЕ ПАЙШЛІ і нічога ў сэнсе ўзмацненьня загатовак бульбы ня зроблена.

Пастанова Эканы аб ДАВЯДЗЕНЬНІ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ ДА АСОБНАЙ ВЁСКІ і аб ударных тэмпах работы па загатоўках у ЖЫЦЬЦЕ НЕ ПРАВОДЗІЦЦА.

Загатоўчыя арганізацыі і выпучаныя спэцыяльныя тройкі па загатоўках за паўтара месяца сваёй работы амаль што нічога не зрабілі. Менская і Аршанская акругі ў сваіх тэлеграмах адзначалі, што толькі зараз праводзіцца нарады па ўзмацненьні загатовак і што на месцы на кіраваны спэцыяльныя работнікі. Іншыя акругі зусім не прысылаюць вестак аб ходзе загатовак, і трэба лічыць, што там справа стаіць яшчэ горш.

Белкаапсаюз і Папяводсаюз, якія праводзяць загатоўку бульбы ў БССР, не прынялі належных мер да разгортваньня загатовак.

Яшчэ горшая справа З АДГРУЗКАЙ БУЛЬБЫ.

Як паведамлялася, згодна пастановы Эканы, за межы БССР павінна было быць адгружана 26.000 тон бульбы, з якіх 20 проц. павінны былі быць адгружаны ў сакавіку, 45 проц. у красавіку і рашта не пазьней 25-га мая. На 20-га красавіка Белкаапсаюзам адгружана ўсяго 655 тон і Беллапяводсаюзам—740 тон. Такім чынам, мы бачым, што НАВАТ НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ НЯ ВЫКАНАНЫ ЗАДАНЬНІ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ НА САКАВІК МЕСЯЦ.

З боку раду нашых арганізацый нагляднюцца фармальныя і бюракратычныя адносіны да адгрузкі бульбы за межы БССР. Былі выпадкі, калі асобныя РВК забаранялі адгрузку бульбы за межы раёну.

Трэба зараз-жа прыняць ТЭРМІНОВЫЯ МЕРЫ ДА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ЗАГАТОВАК І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ. Да гэтай справы павінны быць прыцягнуты рабочыя брыгады, якія працуюць на вёсцы па правядзеньні веснавой засеўнай кампаніі. Загатоўчыя арганізацыі і РВК, якія перашкаджаюць выкананьню пляну загатоўкі бульбы, павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

А.

Пераразьмеркаваньне дэфіцытных будаўнічых матэрыялаў матар'ялаў

Эканомпарада пры СНК БССР спэцыяльнай пастановай абавязала ўсе дзяржаўныя і кааперацыйныя арганізацыі ў тыднёвы тэрмін падаць у акруговыя плянавыя камісіі весткі аб пазлішках на іх складах (у тым ліку і на складах пры пабудовах) дэфіцытных будаўнічых матэрыялаў матар'ялаў.

Дзяржплян пасьля атрыманьня гэтых вестак ад акрэплянаў зробіць пераразьмеркаваньне вызначаных дэфіцытных матар'ялаў паміж будаўнічымі арганізацыямі ў строгай адпаведнасьці з патрэбамі.

— НК РСІ распачаў масавую праверку выкананьня пастаноў аб ільготах былым партызанам і чырвонаармейцам. Камісія НК РСІ выехала па гэтым пытаньні ў Магілеўскую акругу.

— У першых чыслах мая НК РСІ скліча ўсебеларускую нараду камісій па чыстцы савецкага апарату. На нарадзе будзе зроблена падагульненьне вынікаў чысткі.

Пачынаем агляд буйнейшых пабудоў

І. ДОМ УРАДУ

Пабудова Дому Ўраду—самая буйная ў Менску. Яна займае 25 проц. вытворчай праграмы Белдзяржбуду.

— Слабае паступленьне чарцяжоў затрымлівае будаўніцтва. Ёсьць праекты 6-га паверху, іншых няма. Павінна працаваць 1.000 рабочых, працуе 350.

— Масавая работа на пабудове пастаўлена дрэнна: ня зжыты прагулы, працдысцыпліна ў заняпадзе, сацспаборніцтва не разгорнута. Марынуюцца каштоўныя прапановы аб паляпшэньні вытворчасьці.

Дом ураду БССР — буйнейшая пабудова ў Менску. Будаўніцтвам ахоплена тэрыторыя амаль чатырох вуліц. У пратраме работ Менскага аддзяленьня Белдзяржбуду дом ураду займае 25 проц. Кошт будаўніцтва — звыш 5 млн. руб.

Дом будуецца паводле праекту вядомага ленінградзкага архітэктара Ламбарда і павінен быць скончаны да Кастрычніцкіх сьвят 1931 году.

У цэнтральнай частцы дом будзе мець 9 паверхаў, дзе размясьцяцца ЦВК, СНК, 20 наркаматаў і іншых цэнтральных устаноў рэспублікі. Галоўная залля пасяджэньняў зойме 3-х паверховя будынак і разлічана на 1.200 чал.

Пры доме будуюцца вялікі гараж, інтэрнат, тэлефонная станцыя, мэханізаваная пошта, 2 пад'ёмныя машыны.

З пабудовай дому ўраду вызваляюцца тысячы кватэр, якія зараз заняты пад розныя ўстановы.

Натуральна, што такое будаўніцтва, як дом ураду, у якое ўкладваюцца мільёны рублёў, патрабуе сур'ёзнай увагі з боку гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый. Гэтай увагі ў сапраўднасьці няма.

На будаўніцтве ёсьць рад прарываў, якія перашкаджаюць нармальнаму ходу будаўніцтва і нават пагражаюць зрывам выкананьня раду работ у вызначаныя тэрміны.

Узяць хаця-бы праектаваньне. Работы чарцяжы паступаюць з значнымі маруднасьцю. Чарцяжы на шосты паверх ёсьць, а на першы паверх няма.

Адсутнасьць чарцяжоў затрымлівае пачатак кладкі цокальнага паверху і фундаманту залі пасяджэньняў. Вінавата ў несвачасовай падачы рабочых чарцяжоў будаўнічае аб'яднаньне ВСНГ БССР.

Становішча з забесьпячэньнем будаўніцтва дому ўраду важнейшымі будаўнічымі матар'ялам, як таўравыя балкі, арматурнае жалеза, вязальны дрот, водаправодныя трубы, можна ахарактарызаваць, як катастрафічнае. Не хапае таксама лесаматар'ялаў. Цэглы замест 10 млн. штук ёсьць 4 млн 500 тыс. штук. Спрыяючае становішча з цэмэнтам, пяском і гравіем. Наогул-жа будаўніцтва забясьпечана матар'яламі ня больш, як на 30 проц.

Часта матар'ялы дасылаюцца непатрэбнага асартымэнту, што падаражае сабекошт будаўніцтва. Так, замест балек № 24 прысылаюць балькі № 20 і г. д.

Плянуючыя і гаспадарчыя арганізацыі ня прымаюць належных энэргічных мер да зьмякчэньня недахвату ў будаўнічых матар'ялах.

Інжынэрна - тэхнічныя работнікі і ў прыватнасьці, нямецкі інжынэр Райсік, увесьлі прапанову аб замене таўравых балек пустацелымі жалеза-бэтоннымі балькамі, што дало-б эканомію ў тысячы тон таўравых балек.

Але гэта каштоўная прапанова марынуецца ў будаўнічым аб'яднаньні, якое ня прымае належных мер да яе рэалізацыі.

Высунут праект пабудовы на тэрыторыі дому ўраду бэтоннага заводу, які будзе вырабляць гатовыя пліты на месцы для паміжпавярховых перакрыцьцяў, што дасьць значную эканомію ў лесаматар'ялах і паскорыць тэмп работы.

Распачаты вопыты замены натуральнага аблiцовачнага каменю для знадворных сцен штучным каменем.

Адначасова праводзіцца перагляд усіх канструкцый у мэтах скарачэньня магчымага запасу іх моцнасьці, што таксама дасьць значную эканомію матар'ялаў.

Трэба, каб будаўнічыя арганізацыі пранялі больш гібкасьці ў рэалізацыі прапаноў рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу.

Будаўнічыя работы ў бягучым сэзоне пачаліся свачасова. Але плян разгортваньня работы ня выконваецца. На будаўніцтве павінна было быць занята ў 2-х зьменах 1.000 рабочых, працуюць-жа толькі 350. Не хапае цесьляроў, каменшчыкаў, чорнарабочых. Няпрыняцце свачасова мер да забесьпячэньня будаўніцтва рабсілай, марудносьць з падачай рабочых чарцяжоў, перагулярнасьць паступленьня матар'ялаў не дае магчымасьці разгарнуць будаўніцтва і ўвесьці другую зьмену.

На лепшая справа і з тэхнічным пэрсаналам. Замест патрэбных 40 інжынэраў, дзесятнікаў, прарабаў ёсьць толькі 9. Не хапае 5 інжынэраў, 6 прарабаў, 20 дзесятнікаў.

На будаўніцтве не звярачаецца належная ўвага на якасьць работы, якая пакідае жадаць многа лепшага. Так, з прычыны агіднай работы, прышлося ламаць і перарабляць бутавую кладку.

Посьпехі ёсьць у справе мэханізацыі будаўніцтва. Поўнасьцю мэханізуецца транспартаваньне матар'ялаў, устанаўліваюцца 5 пад'ёмнікаў, кансольныя краны, абсталяваць мэ[illegible]ка і г. д.

Большая частка [illegible]ніцтве — сэзонны[illegible] кваліфікацыі і пр[illegible]ганізацыі не пад[illegible] спатканьня. Сэзонны[illegible] інтэрнатамі, у ларк[illegible] і інш. тавараў.

Дырэктыва парт[illegible] фэсыянальных орга[illegible] масавай работы ся[illegible] чых ня выкананы [illegible] работы на будаўні[illegible]ма, што пацвярджа[illegible] фактаў.

У першы дзень [illegible] частка рабочых ня [illegible] другі дзень вялі[illegible]

37 проц. рабочых [illegible]ніцтва прышлося [illegible] Ніякай антыпрагульнай работы ня было праведзена. Дрэнна пастаўлена інтэрнацыянальнае выхаваньне. Панує мацярвшчына, не дзецца адпор рвацтву, наогул антыпрагульгарскім настроям па асобных груп рабочых, галоўным чы[illegible] нам, сэзоннікам.

Працдысцыпліна ў заняпадзе. Н[illegible] працяму месца вынесена каля 15 вы[illegible] моў за самавольнае кіданьне работы, з[illegible] спазьненьні на работу, за п'яньства. 2[illegible] злосных [illegible]каў і парушальн[illegible]каў працдысцыпліны зьняты з работы.

На будаўніцтве зусім не разгорнут[illegible] сацспаборніцтва. Ударныя брыгады з-а адсутнасьці належнага кіраўніцтва ра[illegible]вальваюцца. Ударнікі ні разу ня скл[illegible]каліся. Штабу кіраўніцтва сацспабо[illegible]ніцтвам няма. Рабочая маса ня ўцяг[illegible]нута ў сакаправ[illegible]рку сацспаборніцтва.

Рабочыя пабудовы дому ўраду абсл[illegible]гоўваюцца рабочкомам упіэрсытэцка[illegible] гарадка. У суменным сваім складзе і[illegible] ня здо[illegible] 1.000 рабочых, [illegible] заняты на [illegible] упіэрсытэцкага гарадка і дому ўраду. У рабочкоме пр[illegible]цуюць фактычна толькі 2 чал., якія [illegible] могуць абслугоўваць такую масу раб[illegible]чых. Работніка для правядзеньня мас[illegible]вай работы няма. Рабочком не пераб[illegible]даваў яшчэ сваёй работы на новыя фо[illegible]мы і мэтады і не стварыў вакол ся[illegible] патрэбнага кадру рабочых - добраахво[illegible]нікаў.

Кіраўніцтва з боку ЦП саюзу буд[illegible]нікоў — пераважна папяровае. Праце[illegible]нікі ЦП на будаўніцтве — рэдкія гос[illegible]. Слабая партыйная работа.

Патрэбныя радыкальныя меры для ліквід[illegible]цыі прарываў на пабудове дому ўра[illegible] для ўзмацненьня масавай работы ся[illegible] рабочых будаўніцтва. ЦП саюзу буд[illegible]нікоў паперыраве [illegible]тку нізавых прафар[illegible]нізацый. У першую чаргу трэба арга[illegible]заваць асобны рабочком на пабуд[illegible] дому ўраду.

Дом ураду — буйнейшая пабудо[illegible] яна патрабуе больш сур'ёзнай увагі з [illegible]ку гаспадарчых, партыйных і пра[illegible]сыянальных арганізацый.

МІХ. КІР[illegible]

Напярэдадні гадавіны сацспаборніцтва

Не сьпяшацца, але і не марудзіць!

Праверка выкананьня прамфінпляну і сацдагавароў павінна праходзіць у красавіку-маі.—Больш глыбока вывучаць пастаноўку ўдарніцтва і сацспаборніцтва.—Давесьці прамфінплян да кожнага рабочага

Самаправерка выкананьня сацдагавароў па прадпрыемствах Бабруйшчыны разгортваецца. Па 10-ці прадпрыемствах створана 50 агляданых брыгад, у якія ўлілося больш за 350 рабочых.

На Бабруйскім камбінаце самаправерка праходзіць з посьпехам. Прамфінплян даведзен да варштату.

На гуце «Камінтэрн» у праверачныя брыгады ўцягнута 50 рабочых. Па цэхах вывешваюцца штодзённыя зводкі аб ходзе сацспаборніцтва. Прагулы даведзены да нуля.

У хлебапякарні самаправерачныя брыгады заканчваюць сваю работу.

Але побач з гэтымі станоўчымі прыкладамі ёсьць рад адмоўных.

На мэблевай фабрыцы імя Халтурына, у выніку дрэннага кіраўніцтва з боку трыкутніка (дырэктар фабрыкі і сакратар ячэйкі зьняты з работы, фабком атрымаў вымову), прамфінплян за паўгодзьдзе недавыкананы НА 24 ПРОЦ. Прамфінплян не даведзен нават да цэху.

На пільнях № 6-7 самаправерка разгортваецца марудна. Выпучаныя брыгады слаба інструктуюцца і таму займаюцца амаль выключна праверкай пратвокопаў. Прадстаўнікі АПБ—т. т. Дорахаў і Рыўкін—праверцы дапамагаюць слаба. Прамфінплян да варштату не даведзен.

Марудна працуюць брыгады на Рагачоўскай кардоннай фабрыцы імя Сталіна. Прадстаўнік ЦП саюзу працаўнікоў папяровай прамысловасьці дапамог толькі арганізаваць брыгады і ўцёк у Менск. Прамфінплян да машыны не даведзены.

Заўком фанэрнага заводу імя Томскага брыгадамі кіруе слаба. Фабком да гэтай справы. На сваім пасяджэньні ён стварыў брыгаду і ня вынес пытаньня нават на абгаварэньне агульнага сходу. Рабочыя аб самаправерцы ня ведаюць. Няма лёзунгаў.

Клюбы, як і раней, у праверцы ня прымаюць удзелу.

Дагэтуль ня цікавяцца самаправеркай гаспадарнікі і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал. Дырэктар камбінаванай фабрыкі сарваў сход камсамольцаў, на якім ён павінен быў рабіць даклад, не зьявіўшыся на гэты сход.

А. М.

Вынікі папяровага кіраўніцтва

ЦП саюзу харчавікоў, каб даведацца, што робіцца на прадпрыемствах з самаправеркай выкананьня прамфінпляну і сацдагавароў, склікала нараду добраахвотнікаў—удзельнікаў праверачных брыгад. Нарада паказала, да чаго можа прывесьці паняровае кіраўніцтва. Кампанія вялікай палітычна-гаспадарчай важнасьці на большасьці прадпрыемстваў харчавікоў пад пагрозай зрыву. Не захаваны прынцыпы добраахвотніцтва пры складаньні праверачных брыгад. Рабочым не растлумачана значэньне і прынцыпы праверкі. Удзел рабочых у праверцы непастарчальны. Моладзь, гаспадарнікі і канторскія апараты—зусім у баку.

Больш здавальняюча праходзіць праверка на заводзе «Чырвоная Зара», дзе ня 140 рабочых прымаюць удзел у праверцы 40 чалавек.

На хлебазаводзе выпучана праверачная камісія з 12 рабочых (на заводзе 180 чалавек), але камісія не працуе. Тое-ж самае—на бойні, дзе заўком на сваім пасяджэньні выпучыў брыгаду з 7-мі чалавек (тут таксама 180 рабочых). Заўком сьпіртазаводу выпучыў праверачную брыгаду з 5-ці чалавек. Зразумела, што такое выпучэньне праверачных брыгад, замест таго, каб пляхам мабілізацыі ўвагі рабочых дабіцца ставрэньня масавых праверачных брыгад добраахвотнікаў, ня можа даць станоўчых вынікаў.

Яшчэ прасьцей падышлі да гэтае справы на заводзе «Беларусь». Такім - жа габінэтным шляхам заўком выпучыў брыгаду ў 9 чалавек, якая пасьледвала прыкладу заўкому і таксама габінэтным шляхам выпрацавала анкету і раздала яе адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу. Брыгада паранькла атрымаўшы адказы на анкету, падвесьці вынікі выкананьня прамфінпляну і гэтым абмежавацца.

На каўбаснай фабрыцы, хоць і захаваны прынцыпы добраахвотнасьці, але праверка наогул не даволі растлумачана і папулярызавана.

Фабком абмежаваўся кароткай інфармацыяй у абедзены перапынак. Таму ўдзел рабочых у самаправерцы вельмі слабы. З 130 рабочых прымае ўдзел у праверцы толькі 11 чалавек. Гаспадарнік і работнікі бухгальтэрыі адносяцца да праверкі ганебна.

Каб ня змазаць гэтага важнейшага пытаньня, прадпрыемствы харчавікоў павінны неадкладна выправіць памылкі і зрабіць самаправерку сапраўды масавай.

Д.

Зрываецца пабудова адкормачных пунктаў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Па віне Белмясгандлю зрываецца пабудова адкормачных сьвіных пунктаў. Ня гледзячы на тое, што яшчэ 16 лютага магілеўскі акрмаляжысаюз заключыў дагавор з Белмясгандлем на пабудову сьвінаадкормачнае базы ў Магілеве, гэтае будаўніцтва да апошняга часу не распачата. Белмясгандаль, ня гледзячы на рад прапаноў акрмаляжысаюзу, не высылае ў Магілеў свайго прадстаўніка для канчатковага афармленьня дагавору. Месца для пабудовы адкормачных пунктаў яшчэ ня вызначана, у сувязі з адсутнасьцю праектаў і плянаў будаўніцтва невядома куды падвозіць загатоўлены ўжо будаўнічы матар'ял.

Распушчан прэзыдыум Быхаўскага гарсавету

БЫХАЎ. (Наш кар.). За скрыўленьне клясавай лініі і нежаданьне выправіць памылкі распушчан прэзыдыум Быхаўскага гарсавету.

Прэзыдыум гарсавету ў часе муніцыпалізацыі домаўладаньняў дапусціў грубыя скажэньні клясавай лініі. У муніцыпалізаваных будынках забіралася маемасьць; галавацяны канфіскавалі мэблю, хатнія рэчы ня толькі ў нэпманаў, але і ў саматужнікаў і членаў саюзаў.

Прэзыдыум РВК абвясьціў суровую вымову старшыні гарсавету тав. Баламусіну. Загадчык камгасу Земцаў вынят з работы. Справа перадана пракуратуры для прыцягненьня винаватых да судовай адказнасьці.

Радыё-перадачы

Чацьвер, 24-га красавіка:

17-00. Пасьлязабедзены канцэрт.
17-30. Перадача «Юны тэхнік».
18.00. Беларуская радыё-газэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. Сялянская радыёгазэта.
20.00. Рабоча-сялянскі універсытэт па радыё.
21-30. Канцэрт.

Пятніца, 25-га красавіка:

17-00. Пасьлязабедзены канцэрт.
17-30. Гадзіна абароны краіны і Чырвонай арміі. Аснову ня асаблівасьці сучаснай тактыкі.
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. «Чырвоная Зьмена» па радыё.
20-00. Рабоча-сялянскі універсытэт па радыё.
21-30. Канцэрт.

Субота, 26-га красавіка:

17-00. Пасьлязабедзены канцэрт.
17-30. Перадача для пінэраў і школьнікаў.
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. Гадзіна калектывістага.
19-30. Навукова-тэхнічныя перадачы.
20-00. Рабоча-сялянскі універсытэт па радыё.
21-00. Перадача на мове эсэранта. Падрыхтоўка эсэрантыстых да 1 мая.
21-30. Канцэрт.

Па Савецкай Беларусі

Забясьпечыць разьвіцьцё садова-агароднай справы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Бабруйскі ЦРК сёлета ўпэрыншыю пачынае разгортваць садова - агародную справу. Паводле пляну, ЦРК мяркуе засеяць сёлета каля 100 гэкт. агародаў. Гарсавет ужо вызначыў пад агароды патрэбныя зямельныя вучасткі. Да гэтага часу ўжо засеена 2 з паловаю гэктары морквы, 5 гэкт. бульбаю, вызначана плошча для засеву радыскаю, салатай і буракамі.

Адчуваецца вялікі недахват насеннае бульбы. ЦРК патрэбна 4 вагоны бульбы, а яму пакуль што вызначана толькі паўтара вагона. Адчуваецца таксама недахват у сельска - гаспадарчым інвэнтары.

Сутычка цягнікоў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Нядаўна на ст. Магілеў сутыкнуліся два цягнікі. Адзін выпаў з рэек, другі — сапсаваны. Цэлую ноч працавалі чыгуначнікі, каб падняць параводы. У сутычцы вінаваты машыністы Юшкевіч і качагар Красоўскі, якія вельмі нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў.

Сацспаборніцтва сплаўшчыкаў

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Арцель сплаўшчыкаў в. Гарадзец у ліку 90 чал. выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва арцель сплаўшчыкаў в. Вусьця. Умовы спаборніцтва паступныя: хуткая вязка лесаматар'ялаў, экономнае выдаткаваньне сплаўных прылад, поўнае скарыстаньне работага дня; лесаматар'ял на пункт назначэньня павінен быць дастаўлен на два дні раней вызначонага тэрміну.

Калі нарэшце будуць арганізаваны сьвінаводныя гаспадар[illegible]

Марудзяць з правядзеньнем важнейшага мерапрыемства

Урад БССР ухваліў пастанову аб вылучэньні па тэрыторыі БССР 400 калгасаў і да 70 саўгасаў для арганізацыі ў іх сьвінаводных гаспадарак.

Гэтае важнейшае гаспадарчае мерапрыемства, зьвязанае з забесьпячэньнем рабочых цэнтраў сьвіным мясам і салам, патрабуе для пасьпяховага свайго выкананьня ўдарнасьці і выразнасьці ў рабоце і максымальна шпаркіх тэмпаў. Інакш справа гэта можа сарвацца. Што-ж практычна зроблена па выкананьні гэтага важнейшага мерапрыемства, ці ўжо вылучаны гаспадаркі, ці пачата будаўніцтва, ці прыступлена да ўкамплектаваньня гаспадарак матачным матар'ялам.

Перш за ўсё аб вылучэньні саўгасаў. Праўленьне саюзнага трэсту «Сьвінавод», пад ведама якога павінны перайсьці вылучаныя саўгасныя і калгасныя сьвінаводныя гаспадаркі, вельмі марудзіць з прыёмам гэтых гаспадарак.

Акруговыя камісі

Больш увагі вылучэньню рабочых

Усім кіраўніком аб'яднаньняў прамысловасьці, дырэктарам прадпрыемстваў, ЦП прафсаюзаў, АБПС і заўкомам

Бялізарнейшы рамах сацыялістычнага будаўніцтва ст віць важнейшай задачай забесьпячэньне прамысловасьці пралетарска-адданымі, палітычна і практычна надрытыцыйна-гаспадарчымі і інжынэрна-тэхнічнымі кадрамі. На гледзячы на некаторае разгортваньне справы падрыхтоўкі кадраў прамысловасьці (арганізацыя ў Беларусі ВТНУ, ряду каротка-тэрміновых курсаў і інш.), не дахват, які ёсьць у кіраўнічых кадрах прамысловасьці, у бліжэйшыя гады па можа быць выраішаны толькі праз навучальную установы. У сувязі з гэтым асаблівае значэньне набывае справа вылучэньня на кіраўнічую работу прамысловасьці новых кадраў з рабочых і работніц.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што такое важнейшае пытаньне сацыялістычнага будаўніцтва, як вылучэньне перадавых рабочых кіраўнікоў не заняло яшчэ адпаведнага месца ў рабоце гаспадарчых і прафесіянальных арганізацый, у прыватнасьці, дырэктыва студзеньскага (1930) пленуму ЦК КП(б)Б застанецца амаль на выпаванай. Ня зьніжана інэртнасьць, перашчуваць у справе вылучэньня рабочых, асабліва, работніц. Перавага бюракратычных форм вылучэньня, баз удзелу самой рабочай масы ў вылучэньні і г. д.

Выходзячы з вышэйазначанага, прапануецца ўсім кіраўніком аб'яднаньняў, прадпрыемстваў і прафарганізацыям зараз-жа разгарнуць шырокую работу па вылучэньні на кіраўнічую работу новых кадраў перадавых рабочых—ударнікаў, асабліва работніц.

Мабілізаваць грамадкасьць рабочых мас вакол вылучэньня, паставіўшы справу так, каб кожная кандыдатура вылучэнца наперад абгаворвалася на сходах рабочых, зьяўляючы пры гэтым габінэтны бюракратычны падыход да вылучэньня.

У адпаведнасьці з дырэктывамі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б прапануецца вылучыць да 1-га ліпеня г. г. на кіраўнічую работу (ВСНГ, аб'яднаньні і заводакіраўніцтвы) ня менш 150 рабочых і работніц. Апрача гэтага вылучыць на практычную інжынэрна-тэхнічную работу ня менш, як 50 найбольш кваліфікаваных рабочых і 50 найбольш здольных, якія выйшлі з пралетарскага асяродзьдзя, тэхнікаў на інжынэрную работу, не чакаючы пры гэтым нейкіх асобных раскладаў па асобных арганізацыях і прадпрыемствах.

Паказаная інэртнасьць у вылучэньні рабочых зьяўляецца падвойна мінімальнай. Прафэсыянальным і гаспадарчым арганізацыям паставіць сабе мэтай, каб ня было ні аднэй установы без вылучэнца (дзе ня менш, як два пастаянных кіраўнікі). Адначасова гэта ня спыняе патрэбнасьці заматнчэньня пасад вылучэнцамі і дзе адзін кіраўнік.

Побач з разгортваньнем работ па вылучэньні, неабходна прыняць захады да арганізацыі падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі вылучэнцаў арганізацыі для ўсіх курсаў пры аб'яднаньнях. Арганізаваць адпаведную дапамогу вылучэнцам у часы іх практычнай работы, склікаючы пэрыядычна на прафлініі нарады вылучэнцаў.

Адным з недахопаў зьяўляецца адсутнасьць уліку работы з вылучэнцамі, што не дае магчымасьці ацаніць сапраўднае становішча з вылучэнцамі. Прапануецца ўсім кіраўніком аб'яднаньняў і прадпрыемстваў і прафарганізацыям сыстэматычна да 5-га числа кожнага месяца за мінулы месяц прадстаўляць весткі па даданай пры гэтым форме. Весткі пасылаюцца заводакіраўніцтвамі ў аб'яднаньні і апошнімі ў ВСНГ, заўкомы ў АБПС і апошнія ў ЦСПСБ.

Апрача гэтага прадстаўіць па тэй-жа форме весткі не пазьней 21-IV 30 г. на ўсіх вылучэнцаў, якія ўжо працуюць, запосячы ў сьпіс вылучэнцаў таварышоў, якія вылучаны на кіруючую работу за пэрыяд з 1-га студзеня 1928 г. па апошні час.

Вылучэнцамі лічыць пасады ад загадчыка цэхам і роўналежнай яму пасады і вышэй.

Старшыня ЦСПСБ РЫЖОЎ.
За старшыню ВСНГ БССР ВАЙСКАБОЙНІКАЎ.

ТЫ ЯШЧЭ НЯ КУПІЎ БІЛЕТАЎ 4-Й ЛЕТАРЭІ АСОАВІЯХІМУ?

ТЫРАЖ

білетаў 4 разрада 4-й лётарэі Асоавіяхіму адбудзецца ў Менску 2—3 мая г. г.

БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 3.000 выйгрышаў)—(НА СУМУ 45.074 руб.

БІЛЕТ КАШТУЕ 50 кап.

Спяшайцеся купіць білеты! Узмацняйце абарону!

Білеты прадаюцца ў арганізацыях Асоавіяхіму.

КЛЮБ ІМЯ ЛЕНІНА (б. Чырв. Заля).

Чацьвер, 24 красавіка

Пачатак роўна а 7 г. увеч.

Вучні, піянэры ўпяшайцеся на ЗЬЛЁТ!

Да ведама Юных Прыхільнікаў МОПР'у!

Менакругком МОПР'у, Менакрсавет „бязбожнікаў", Менакрбюро ЮКА і Менакрана

СКЛІКАЮЦЬ

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ піянэраў і вучняў Юных Прыхільнікаў МОПР'у і юных „Бязбожнікаў".

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб далейшых задачах інтэрнацыянальнага выхаваньня ЮПМ і ЮБ.—дакл. т. КАЛМЫК.
2. Рапарты з месц аб пастаноўцы інтэрнацыянальнай работы.
3. Выбары делегатаў на ўсесаюзную экскурсію-канфэрэнцыю ЮПМ і ЮБ.

Модус выбараў делегатаў на зьлёт—1 дэл. на 50 ЮПМ і ЮБ.

Запрашаюцца ўсе настаўнікі і асьветнікі гор. Менску.

Просьба зьявіцца без спазьненьня. | Менакругком МОПР'у, Мен. АСВБ, Мен. АБ ЮКА і Менакрана.

Да ведама юных бязбожнікаў!

МЕНСК

Новае палажэньне аб сельсаветах

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў новае палажэньне аб сельсаветах. Паводле гэтага палажэньня, сельскі савет зьяўляецца вышэйшым органам улады ў межах сваёй тэрыторыі. Ва ўсіх сельсаветах уводзяцца самастойныя бюджэты, арганізоўваюцца групы беднаты, якія зьяўляюцца галоўнай апорай сельсаветаў у правядзіньні імі мерапрыемстваў. Сельсаветы маюць права выдаваць абавязковыя пастановы, а таксама разглядаць і вырашаць справы аб парушэньні абавязковых пастаноў як сваіх, так і выканаўчых камітэтаў і накладваць на вінаватых пакаранньні, паводле існуючага заканадаўства.

Да 1-ку гісторыі партыі і Кастрычн. рэвалюцыі на Украіне

Інстытут гісторыі партыі і Кастрычн. рэвалюцыі на Украіне пры ЦК КП(б)У просіць таварышоў, якія маюць у сябе якія-небудзь друкаваныя выданьні (газэты, праклямацыі, адозвы і інш.) якой-небудзь з арганізацый КП(б)У пэрыяду гэтманшчыны (красавік-сьнежань 1918 г.) прыслаць іх, ці хоць бы дакладныя копіі іх, у інстытут па адрасе:—Харкаў, вул. Свабоднай Акадэміі № 8а.

Да канфэрэнцыі эканамістых, скончыўшых БДУ

Факультэт праўгасу просіць усіх эканамістых, скончыўшых БДУ як па б. ф-це грамадз. навук, так і па праўгасе дасласць весткі аб сваёй працы па анкеце, якую пражываючыя ў Менску т.т. атрымаюць у дэканаце, а пражываючыя за Менскам — паведаміўшы свой адрас.

З запыт. зьвяртацца па адрасе: Менск, БДУ, факультэт праўгасу. Тэрмін падачы вестак — 1-га мая.

6 год шматтыражкі „Чырвонае Шыла"

Гэтымі днямі ў клюбе друкароў адбыўся ўрачысты вечар, прысьвечаны шасьцігодзьдзю са дня выхаду першага нумару шматтыражовае насьценгазэты рабочых 1-ай друкарні «Чырвонае Шыла». На вечары прысутнічала шмат рабочых друкароў. Газэта ў сваёй працы мае рад дасягненьняў, зараз яна выходзіць у колькасьці 600 экзэмпляраў.

Стары рабкор «Чырвонага Шыла» тав. Глазоў расказаў рабочым аб тых няжкасьцях, якія сустракаліся ў рабоце рэдкалегіі ў першым часе выхаду газэты. Рабочыя пастанавілі перайменаваць газэту «Чырвона шыла» ў «Друкарскую праўду».

Клюб Навуковых Працаўнікоў

Намечаны цыкль лекцый на Уводзінах у дыалект. матэрыялізм.

1 лекцыя—асноўныя этапы разьвіцьця матэрыял. думкі—С. Я. Вальфсон.
2 лекцыя—дыялектыка грам. працэсу,—Р. М. Выдра.
3 лекцыя—барацьба клясаў і вучэньне аб дыктатуры пралетарыяту,—т. Галанда.
4 лекцыя—тэорыя вытворчых сіл і вытворчых суадносін,—т. Сакерская.
5 лекцыя—дыскусія дыялектыкаў моханістых—т. Валабрынскі.

1-ая ЛЕКЦЫЯ адбудзецца 28 красавіка а 9 гадз. увечары.

Аб дні астатніх лекцый будзе паведамлена асобна.

Вытворчыя нарады пры сельсаветах

Прэзыдыум ЦВК вынес пастанову аб вытворчых нарадах пры сельскіх саветах, якія арганізуюцца замест с.-г. сэкцый. Сельска-гаспадарчыя вытворчыя нарады маюць на мэце распрацоўку і ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі свайго раёну, а таксама па пашырэньні пасоўных плошчаў, узьняцьці ўраджайнасьці і інш. У склад вытворчых нарад уваходзяць члены сельсаветаў і рэвізійных камісій, прадстаўнікі саўгасаў, калгасаў і каапэрацыйных с.-г. аб'яднаньняў. Склад вытворчых нарад зацьвярджаецца сельсаветам. Усе свае пастановы вытворчыя нарады падаюць на зацьвярджэньне сельсавету. С.-г. нарады выбіраюць з свайго складу бюро з 5-7 чал.

Зацьверджаны склад ВСФК

Прэзыдыум ЦВК БССР зацьвердзіў палажэньне аб вышэйшым савеце фізкультуры пры ЦВК БССР. У склад ВСФК уваходзіць 60 асоб: прадстаўнікі ад усіх акруг, прафэсыянальных органаў, ЛКСМ, Рэвваенсавету БВА, Асоавіяхіму, Наркамасьветы, НКАЗ і спартыўнага т-ва «Дынама». Прэзыдыум ВСФК зацьверджаны ў складзе 15 чал.

За дзень

— Неўзабаве ў Менску адбудзецца ўсебеларуская нарада пажарных працаўнікоў, на якой будзе пастаўлена пытаньне аб пажарнай ахове ў калгасах і задачах пажарных арганізацый у абароне краіны.

— 24 красавіка адбудзецца пашыраны пленум новага складу ВСФКБ. У працы пленума прыме ўдзел, апрача 60 делегатаў, актыў фізкультурнікаў у ліку 60 чал. З дакладам аб выніках усесаюзнага пленуму ВСФК выступіць адказны сакратар ВСФК СССР т. Грыгор'еў.

Дзень „Чырвонай Кветкі"—у Менску

Менакругком МОПР'у паведамляе, што для ўдзелу ў першамайскім скарбоначным зборы з «Чырвонай кветкай» 1-га і 2-га мая і «шествии каторжан» усе ячэйкі МОПР'у г. Менску выпучаюць па 2-3 чалавекі з найбольш актыўных і аўтарытэтных мопраўцаў.

30-га красавіка а 3-й гадз. дня усе выпучаныя для ўдзелу ў скарбоначным зборы і «шествии каторжан» павінны зьявіцца ў АК МОПР (Савецкая, 87) для атрыманьня скарбонак, чырвоных кветак і адпаведных дакумантаў.

30-га красавіка а 5 гадз. увечары ўсе ўдзельнікі скарбоначнага збору і «шествия каторжан» у арганізаваным парадку прадэманструюць па горадзе пад музыку і факеламі з мэтай папулярызацыі дня «Чырвонай кветкі» па г. Менску.

30-га красавіка, 1-га і 2-га мая бязупынна ў АК МОПР будуць устаноўлены дзяжурствы для выдачы скарбонак, «чырвоных кветак» і прыёму сабраных сродкаў.

У скарбоначным зборы прымуць удзел артыстыя БДТ-2, каманда самакатчыкаў і інш. Усяго каля 600 чал.

МЕН. АК МОПР'У.

Арганізавана навуковае хэмічнае таварыства

24 красавіка распачынае сваю працу навукова - тэхнічнае таварыства хэмікаў Беларусі.

Момант заснаваньня т-ва супадае з пачаткам грандыёзнага будаўніцтва хэмічнай прамысловасьці ў БССР.

У задачы таварыства ўваходзіць—уцягнуць у будаўніцтва хэмічнай прамысловасьці шырокую масу рабочых хэмікаў, а таксама хэміка-тэхнолёгаў. Першы ўстаноўчы сход таварыства адбудзецца 24-га красавіка а 7 гадзін увеч. у вялікай хэмічнай аўдыторыі хэмкорпусу БДУ. На сходзе інжынэр КАПЛАН азнаёміць прысутных з задачамі таварыства, а інжынэр НАТАНСОН зробіць даклад аб пяцігадовым пляне нашага хэмічнага будаўніцтва.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Пасяджэньне таварыства гісторыкаў-марксыстых у 20 гадз. — памяш. камвузу.

Дом Камасьветы. У 19 гадз. (пак. № 21) індывід. кансульт. па гісторыі клясавай барацьбы па Захадзе.

— У 19 гадз. (пак. № 3) заняткі гуртка ангельскае мовы.

Дом Асьветы. Заняткі палітгуртка партколектыву КП(б)Б працасьветы ў 19 гадз.

Пэдгабінэт. У 19 гадз.—канфэрэнцыя фізкультурнікаў. Разгляд новых праграм.

Нарада камс. актыву к-ву ЛКСМБ БДУ. Пач. у 19 гадз. (аўд. № 1—прыродазнаўч. корпусу).

ЗАЎТРА

БДУ. (Стары будынак, 41 аўд.). Працяг нарады студэнтаў і навуковых працаўнікоў ф-ту, савбудаўніцтва і права па абгаварэньні дакладу праф. Канапліна. Яўка абавязкова.

Кастрычніцкі РК МОПР'у. Пасяджэньне прэзыдыуму ў 19 гадз. Выклікаюцца члены прэзыдыуму і т.т., выпучаныя для працы ў райкоме МОПР'у ў арганізацыі, а таксама члены рэўкамісіі.

Выстаўка першамайскай літаратуры. У чытальні Дому Камасьветы арганізавана выстаўка літаратуры і матар'ялаў да дня 1-га мая для дакладчыкаў, а таксама паладжаны выстаўкі ў партгабінэтах на заводзе «Бальшавік» і ў 1-й друкарні.

АД МЕНСКАЕ АКК КП(б)Б

Наступныя т.т. выклікаюцца на 25 красавіка, а 10 гадз. у АКК для разгляду іх спраў: Белахвосьцік П. Я.—Бярэзінскі раён, Крайнік Я. Я.—Лагойскі раён, Барысавец П. Х., Чубенка А. І. і Мэер У. Н.—Н-скі п/атрад, Шчавінскі Х. Д.—яч. Менвасшпіталю, Старповіч І. Л.—яч. пэдфаку, Фэдарычык І. С.—Белсельсаюз, Накса Я. Ф.—лямцавая ф-ка, Гэльтман-Машынская Я. У.—польпэдтэхнікум, Ваўчкоў С. В., Саўкоўскі В. Г. і Пяшкоў М. А.—зав. «Камунар», Родман Г. Г. і Міленькі А. І.—зав. «Пралетары», Каган Я. С.—яч. грузчыкаў. Гутарман І. Я.—футровая фабрыка і Блюміи М. Л.—шчацінная ф-ка.

Апрача паказаных таварышоў, павінны прысутнічаць сакратары парт'ячэек, у якіх знаходзяцца гэтыя таварышы, а таксама члены праверкому, якія праводзілі чыстку. Праезд за свой кошт.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Для ўдзелу ў першамайскай дэманстрацыі

Аўтадор, Бюро ФК ЦСПСБ і Асоавіяхім

арганізуюць

калёну взлёсыоздыстых, матацыклістых і аўтамабіляў.

Ячэйкам Аўтадору, Асоавіяхіму і гуртком фізкультуры правесьці падрыхтоўку для ўдзелу ў дэманстрацыі.

Бел. МБІТ склікае на СЁНЬНЯ, а 7-ай гадз. ўвеч. у клюбе Гарсавету

агульна-гарадзкі сход спэцыялістых

—членаў ІТС г. Менску

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Задачы і мэты Палесмозіязена і вытворчы плян на бягучы сезон.

Запрашаюцца усе інж.-тэх. работнікі г. Менску.

Прэзыдыум Бел. МБІТ.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68-)

Сёньня, 23-га красавіка адбудзецца даклад дацэнта БДУ тав. САЎСУНА на тэму:

„ПРАБЛЕМА ЛІТАРАТУРНАГА СТЫЛЮ".

Пасьля дакладу абмен думкамі.

Запрашаюцца пісьменьнікі, навуковыя працаўнікі, студэнты, рабочыя, настаўнікі і ўсе, хто цікавіцца гэтым пытаньнем.

Пачатак а 7 з палов. гадзіне.

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ ДОМУ ПІСЬМЕНЬНІКА.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чыцьверты) у Менску

Серада, 23 красавіка, для Ц. Д. Школы
Чацьвер, 24 красавіка, для 7-й сав. школы

КАЛІ ПЯЮЦЬ ПЕЎНІ п'еса ў 7 абразох, 5 дзеях. Юр. Юр'ін

Рэшта білетаў у касе тэатру. Пачатак а 8 гадз.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. Пятніца, 25 красавіка

Адзіны канцэрт Дзяржаўнага Квартэту імя Вільома

У праграме: Бэтховен, Чайкоўскі, Грыг, Казіцкі, Чуркін.

Пачатак а 9 гадз.

Білеты штодзенна ў касе тэатру і ў рабочай касе.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Звыш праграмы прыехаўшы з-за мяжы нямецкі вынаходца Джэфрыс дэманструе сваю вынаходку РАДЫЁ-КАРАБЕЛЬ.

На экране 1) мастацкі фільм „Артэнніно" ЗАМАЛУ ў 7 част. 2) культ.-фільм ПАМЯЦІ ІЛЬЛІЧА ў 1 част.

Дзённыя сэансы: 1 гадз., 3 гадз., 15 м.

Каса ад 12 г. дня. Цэны ад 15 к. да 35 к. Пач. вечерн. сэанс. а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО ПЕТРАВАЦЬЯНА

Мастацкі фільм, вытворч. Ленінгр. Савкіно ХТО ВІНАВАТЫ?

Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 15

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.

Каса ад 5 гадз.

На дзённыя сэансы каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Мастацкі нямецкі фільм паводле навэлі Стэфана Цвэйга СТРАХ драма ў 8 частках.

Штодзенна 3 сэансы.

Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Каса ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"

КУЛЬТУР-ФІЛЬМ СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ (МОДНА

этнаграфічны нарыс у 7 частках.

Штодзенна 2 сэансы.

Пачатак 1-га сэансу а 5 г., 2-га—а 3 г. 20 м.

Каса адкрыта з 12 гадз.

КІНО СПАРТАК

Замежны мастацкі фільм ПРАКУРОР ЁРДАН драма ў 7 частках.

Пач. 1-га с.—7 г., 2-га с. 9—г., 3 с.—10 г. 30 м.

Каса—ад 5 г.

ЗЬЦЯГІ а 1-майскіх сьвят

ПРАДАЮЦЦА Ў ТАВАРЫСТВЕ „Прыхільнік дзяцей" —Савецкая, 40, і ў магазыне т-ва—Ленінская, 26.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" званоце на тэл. 7-81

Выйшаў абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

У СУВЯЗІ З ПАСТАНОВАЙ САВЕТУ ПРАЦЫ І АБАРОНЫ АД 27-VIII—29 г., якой на „САЮЗЛЕС" ускладзена арганізацыя ляснога рынку,

Беларускае Аддзяленьне „САЮЗЛЕСУ"

для выяўленьня сапраўднай патрэбнасьці ў лесаматар'ялах па Беларускай Рэспубліцы і забесьпячэньня на 1930-31 год адпаведнай лесапрадукцыяй усіх спажыўцоў (Аб'яднаньні ВСНГ БССР, Акруговыя Інспэкцыі Мясцовай Прамысловасьці, усе Наркаматы, Акрвыканкомы, Белжылсаюз, Белкалгассаюз, Белкаапсаюз, Белсампрамсаюз, Белдартранс, і інш.), просяць на працягу месячнага тэрміну, **але не пазьней 1-га чэрвеня 1930 г.**, падаць у Беларускае Аддзяленьне Саюзлесу ў Менску і ў копіі свайму цэнтру, **заяўкі па друкуемай пры гэтым форме аб патрэбнасьці ў лесаматар'ялах** як для будаўніцтва, так і для вытворчасьці ў паасобку, а таксама і ў дровах на 1930-31 год.

Пры складаньні заявак належыць выходзіць з зацьверджаных СНК БССР лімітаў капітальнага будаўніцтва і далейшага росту вытворчасьці ў 1930-31 г., строга прытрымліваючыся дырэктывы ўраду аб неабходнасьці ўсямернай жорсткай эканоміі ў спажываньні лясных матар'ялаў.

Патрэбная колькасьць у лесаматар'ялах і дровах на 1930-31 год павінна быць абаснована шляхам кароткіх паказаньняў у тлумачальнай запісцы, якая далучаецца да заяўкі.

Саюзлес папярэджвае ўсіх спажыўцоў, што непадача ў паказаны вышэй тэрмін абаснаваных заявак на патрэбную лесапрадукцыю, пазбавіць іх права прэтэндаваць на атрыманьне лесапрадукцыі на 1930-1931 год.

Узгоднена з ВСНГ БССР.

Упоўнаважаны Саюзлесу па БССР МАРОН.

Аддзел плянавага разьмеркаваньня АРДАШНІКАЎ.

ФОРМА ЗАЯЎКІ на ЛЕСАПРАДУКЦЫЮ на 1930-31 год.

Назва лесаматар'ялаў	Адзін вымер.	Фактычнае спажываньне за 1928-29 г.			Арыентыровачнае спажываньне за 1929-30 г.			Мярнуемае спажываньне на 1930-31 г.			Неабходная астача на 1-X=1931 г.
		Астача на 1-X—1928 г.	Гадавое спажываньне	У тым ліку для вытворч.	Астача на 1-X—1929 г.	Гадавое спажываньне	У тым ліку для вытворч.	Мярнуемая астача на 1-X—1930 г.	Агульная гадавая патрэбасьць.	У тым ліку для вытворч.	
I. Піламатар'ялы	к.-м.										
II. Перавозныя брусы.	»										
III. Круглый лес.											
а) Піловачная сыравіна	»										
б) Будаўнічыя бервяны	»										
в) Падтаварнік	»										
г) Тэлеграфныя слупы	шт. к.-м.										
IV. Баляны	р.-м.										
а) Яловыя											
б) Асінавыя											
V. Стойкі	р.-м.										
а) Сасновыя											
б) Дубовыя											
VI. Абапол	шт.										
VII. Шпалы											
а) Шыронакал. хвойныя	шт.										
б) » дубовыя	»										
в) Вузкакалейныя	»										
VIII. Фанэра лясная	к.-м.										
а) II гатунку											
б) III гатунку											
в) IV гатунку											
IX. Абозныя і шчапныя вырабы											
а) Абод	стан.										
б) Сьпіца	шт.										
в) Клетка кал. асінавая	»										
г) » » дубовая	»										
д) » пілеяная	»										
е) Дран скрыпачная	»										
ж) Гонт штукат.	каца										
X. Дровы і г. д.	р.-м.										

Выйшаў з друку і рассылаецца № 3 (17) за сакавік 1930 г. часопісі Прэзыдыуму ЦВК БССР па савецкім будаўніцтве

САВЕТЫ БЕЛАРУСІ

Саветы і выканкомы, культасьветныя установы і калгасы, савецкія актывістыя і актывісткі!

кожны павінен быць чытачом, падпісчыкам, карэспандэнтам

ДАПАМАГАЦЬ РАСПАУСЮДЖВАНЬНЮ ЧАСОПІСІ САВЕТЫ БЕЛАРУСІ.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На год—2 р. 40 к., на 6 мес.—1 р. 20 к., на 3 мес.—60 кап.

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 20 кап.

Заказы і грошы адрасуйце: г. Менск, Пляц Волі № 17—ЦВК БССР.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЮ ПАТРЭБНЫ ДЛЯ РАБОТЫ Ў КІРАЎНІЦТВЕ

ІНЖЫНЭР-будаўнік
ІНЖЫНЭР-мэханік
ІНЖЫНЭР па плянаваньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і абмену вопытам,
ІНЖЫНЭР па плянаваньні вытворчасьці,
ІНЖЫНЭР па ліцейнай справе,
ІНЖЫНЭР па прафасьвеце,
ІНЖЫНЭР па тэхніцы бясьпечнасьці і аховы працы,
ТЭХНІК-будаўнік,
ТЭХНІК па тэхніцы нармаваньня
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў а.-г. машын і мат. вырабаў,
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў машына-будаўніцтва

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Прапановы накіроўваць па адрасе:

Менск, Ракаўская, 8, Белмэталяаб'яднаньню, тэлефоны: 10-21, 10-33, 15-79.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ.

ЗГУБЛЕН БЛЁКНОТ з паперамі. Просьба зьвярнуць па адрасу: вул. Карла Маркса, № 7, кв. 7. Е. І. А

ПАТРЭБНА ПІШУЧАЯ МАШЫНКА Зварочвацца ў к-ру газ. «ЗЬВЯЗДА».

ПРАДАЮЦЦА БОЧКІ 3-ПАД ФАРБЫ і шкляныя балёны ад кіслоты. Савецкая 63, друк. „Зьвязды" зварачвацца да заг. гас. ад 9 да 11 гадз. ран.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званоце на тэл. 2-49

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: шиффоном золот., серебр., масляк., рельефн. анилин. не расплыв. красками. Бисеры, жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО. МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.